Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 студзеня 2022 г.
ПЯТНІЦА
№ 13 (29635)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

## РЭФЕРЭНДУМ ПРОЙДЗЕ 27 ЛЮТАГА

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 20 студзеня падпісаў Указ № 14 «Аб назначэнні рэспубліканскага рэферэндуму».**

У адпаведнасці з дакументам рэспубліканскі рэферэндум па пытанні ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь назначаны на 27 лютага 2022 года.

Указам вызначана фармулёўка вынесенага на рэферэндум пытання, якая даслоўна ўзнаўляецца ў бюлетэні для галасавання: ***«ЦІ ПРЫМАЕЦЕ ВЫ ЗМЯНЕННІ І ДАПАЎНЕННІ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ?»***

Змяненні і дапаўненні Канстытуцыі, якія выносяцца на рэферэндум, прыкладаюцца да ўказа.

З улікам устаноўленых Выбарчым кодэксам патрабаванняў замацавана абавязковая юрыдычная сіла рашэння, прынятага рэспубліканскім рэферэндумам. Вызначаны парадак уступлення ў сілу такога рашэння — праз 10 дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання. Устаноўлена, што рашэнне, прынятае рэферэндумам, з'яўляецца неад'емнай часткай Канстытуцыі.

Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў даручана арганізаваць правядзенне рэферэндуму, забяспечыць падвядзенне яго вынікаў і ажыццяўляць кантроль за выкананнем заканадаўства ў адпаведнай сферы.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КУХАРАЎ, старшыня Мінгарвыканкама:**

*«Нягледзячы на ўсе цяжкасці, у 2021 годзе эканоміка Мінска спрацавала належна, з ростам асноўных паказчыкаў. Аб'ём бюджэту павялічыўся на 24 працэнты, ВРП склаў 103,2 працэнта да ўзроўню мінулага года. Значна выраслі аб'ёмы экспарту. Ужо пара думаць аб тым, як эканоміка спрацуе сёлета. Бо ад напаўнення бюджэту залежыць развіццё горада».*

## КОРАТКА

- **У школах уводзяцца бясплатныя падарожжы для старшакласнікаў. Ужо ў 2023 годзе навучэнцы 10—11-х класаў змогуць скарыстацца правам паехаць на экскурсію, якая дапоўніць іх веды па тым ці іншым школьным прадмеце.**
- У Мінску разглядаюць магчымасць пераводу гарадскага транспарту на скразную нумарацыю.
- **Інфармацыйную сістэму доказаў генацыду ў перыяд вайны плануецца стварыць у Беларусі.**
- Захваральнасць на грып і ВРІ ў Беларусі вышэйшая за леташні паказчык на 9,6 %.
- **Рэйс з Кітая даставіць у Беларусь 3 мільёны доз вакцыны супраць COVID-19.**

ISSN 1990 — 763X

# ЖАДАНЫЯ ГОСЦІ З ДОБРЫМІ НАВІНАМІ




У свае 85 гадоў (а праз тыдзень будзе восемдзесят шэсць) Аляксандр ШКІНДЗЕР атрымлівае друкаваную прэсу, у тым ліку і «Звязду». Дарэчы, выпісвае нашу газету не меней як трыццаць гадоў. На жаль, дзядуля так і не змог дакладна ўзгадаць той момант, калі першы раз газета стала прыходзіць у яго дом у вёску Валосавічы Лепельскага раёна. Тады Аляксандр Якаўлевіч працаваў трактарыстам, вальшчыкам лесу, вадзіцелем «хлебавозкі» (у вёсцы была свая хлебапякарня), потым на ГАЗ-51 падвозіў на фермы даярак і цялятніц. Дасылаў у газету свае назіранні і нават вершы. Цяпер наш падпісчык жыве ў райцэнтры ў дзяцей, у невялікім дамку. Па-ранейшаму цікавіцца навінамі, і асноўная крыніца навін — «Звязда». Дарэчы, дзядуля чытае без акуляраў, ведае нашых аўтараў, чакае ад іх новых цікавых публікацый. На гэтым здымку Аляксандр Шкіндзер з сынам Васілём і дачкой Жаннай. Сын жыве ў вёсцы, не так часта яму даводзіцца сустракацца з татам, а дачка, наадварот, кожны дзень прыходзіць, дапамагае і прыносіць свежую газету.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

### Проста аб складаным

## НАВУКА ГОЛАСУ, ДЫЗАЙН ЛЕКАЎ І САКРЭТ ШЧАСЛІВАГА БАЦЬКОЎСТВА

**Як суперкамп'ютар і штучны інтэлект дапамогуць перамагчы вірусы? Чаму натуральнае апладненне — гэта гульня ў рулетку? Што наш мозг лепш «чуе»: словы або эмоцыі? Што такое эмацыянальны слых? Які павінен быць сапраўдны «разумны дом» і каму ён насамрэч патрэбны? Адказы на гэтыя і іншыя пытанні атрымалі ўдзельнікі форуму навукі і бізнесу «Інавацыйны шторм», арганізаванага Мінскім гарадскім тэхнапаркам пры падтрымцы Мінгарвыканкама.**

СТАР. 19

### Карысны вопыт

## «ЗЯЛЁНЫЯ КРОКІ» ДА ТУРАВА ДАВЯДУЦЬ



**Асэнсаванае спажыванне, барацьба з кансумерызмам, адмова ад лішніх пакупак, расхламленне... Асядлаўшы гэтыя цікавыя «сацыяльныя хвалі», блогеры па ўсім свеце ў інтэрнэце прадаюць свой досвед за вялікія грошы. Настаўніца беларускай мовы Таццяна ЗЯМЛЯНІК з Турава многім аўтарам матывацыйных ролікаў у сеціве дасць фору. Але над размовамі на камеру яна аддае перавагу рэальным «зялёным крокам», якія робіць разам са сваімі вучнямі. Уласны трэнінг па «расхламленні» жыццёвай прасторы для падлеткаў настаўніца з глыбінкі нядаўна прэзентавала ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка.**

СТАР. 6

З першых вуснаў

# «Неабходна закладаць моцны фундамент пад наша супрацоўніцтва»

**Новыя далягляды супрацоўніцтва Беларусі і расійскіх рэгіёнаў абмеркаваў Прэзідэнт Беларусі з кіраўніком Рэспублікі Тыва Уладзіславам Хавалыгам.**

Тыва вядомая як край качэўнікаў, шаманаў і будыстаў на поўдні Усходняй Сібіры. Рэспубліка ў самым цэнтры Азіі мае агульную граніцу з Манголіяй і прасторы са стэпаў, снежных гор і тайгі. Гэта крыху іншая Расія, вядомая не кожнаму беларусу.

З эканамічнага боку Тыва мае агульныя рысы з Беларуссю. Апошнія гады там актыўна развіваецца сельская гаспадарка, прамысловая вытворчасць, будаўнічая сфера. Але ў лічбах узаемадзеянне нашай краіны з гэтым азіяцкім рэгіёнам Расіі пакідае жадаць лепшага. Тавараабарот у 430 тысяч долараў у 2019 годзе знізіўся ў 2020-м да 275 тысяч, а за студзень — лістапад летась увогуле склаў 48 тысяч. Таму кіраўніку рэгіёна Уладзіславу Хавалыгу было аб чым пагутарыць з Прэзідэнтам Беларусі. Да таго ж гэта першы візіт прадстаўнічай дэлегацыі Тывы ў Мінск. Гэта на пачатку сустрэчы і адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Перакананы, ваш візіт — знакавая падзея, якая дазволіць нам разам адкрыць новыя гарызонты супрацоўніцтва, а гэта трэба абавязкова зрабіць у імя нашых брацкіх народаў. Я на гэта спадзяюся і перакананы, што так і будзе. Інакш чаго было ляцець у такую далеч, у Беларусь?! Так, пазнаёміцца, даведацца, як жывуць вашы браты беларусы важна. Але неабходна і закладаць моцны фундамент пад наша супрацоўніцтва», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы, што патэнцыял у супрацоўніцтве з гэтым расійскім рэгіёнам велізарны.

Прэзідэнт Беларусі запэўніў суразмоўцаў: любыя рашэнні ў эканамічным плане гатовы прыняць зараз, бо ў нашай краіны асаблівае стаўленне да Расіі. З улікам патрэб Тывы і прамысловага патэнцыялу Беларусі асаблівую ўвагу ўдзяліць Аляксандр Лукашэнка прапанаваў прадукцыі машынабудавання. «Вы ведаеце ўзровень нашай машынабудаўнічай галіны. Ды вы можаце і пазнаёміцца з любым прадпрыемствам. Для вас адчынены дзверы любога прадпрыемства: і абароннага (ваенна-прамысловага комплексу), і сельгаспрадпрыемства, і прамысловага. Любога. У нас ад вас няма ніякіх сакрэтаў. Вы ведаеце, што мы можам ствараць: гэта і аўтамабілі, тэхніка і будаўнічая, і дарожна-будаўнічая, і сельскагаспадарчая, і камунальная. Паглядзіце на гэтыя заводы», — прапанаваў Прэзідэнт.

Гатовы беларусы пастаўляць і прадукты харчавання ў сібірскі рэгіён. «Яны вельмі папулярныя ва ўсім свеце. Летась мы на гэтым зарабілі крыху менш за сем мільярдаў долараў — на экспарце гатовых прадуктаў харчавання. Ды і не толькі гэта мы можам вам пастаўляць, нягледзячы на пяць тысяч кіламетраў паміж намі», — заўляе кіраўнік краіны.

Прэзідэнт адзначыў прыгажосць тувінскага краю, туды запрашаў і Уладзімір Пуцін. Па яго словах, ведаць магчымасці гэтай зямлі неабходна і для сумеснай выпрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі. «Мы гатовы ў гэтым плане з вамі працаваць», — сказаў ён.

У прыклад Аляксандр Лукашэнка прывёў праекты з Сахалінам. Рэгіён таксама далёкі ад Беларусі, але сумесныя праекты ў аграрнай сферы там удала рэалізуюцца. Таму і з Тывай беларусы могуць падзяліцца напрацоўкамі, якія маем у сельскай гаспадарцы.

Трансфер тэхналогій, заявіў Прэзідэнт, актуальны не толькі ў сферы АПК, але і ў навукаёмістай прамысловасці. Усё, што спадабаецца гасцям, беларусы гатовы прапанаваць. Асабліва звярнуў увагу кіраўнік краіны на перавагі беларускай мадэлі ў будаўнічай сферы.

«У нас захаваліся буйныя вытворчыя трэсты, як у савецкія часы, калі з нуля маглі пабудаваць любое прамысловае прадпрыемства, жылы дом, дарогі. І гэтыя дзяржаўныя буйныя арганізацыі, кампаніі, трэсты сёння ажыццяўляюць будаванне ад дарог да прамысловых аб'ектаў. У нас ёсць і прыватныя будаўнічыя кампаніі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён акцэнтаваў, што магчымасці для работы ў Беларусі ёсць і ў прыватных кампаній, але асаблівасць айчыннай эканомікі — штучна не разбураць дзяржаўныя прадпрыемствы.

«Гэта была наша палітыка. І мы бачым у гэтым немалую перавагу. Тая ліхаманка на прыватныя (кампаніі. — **«Зв.»**) прайшла, працуюць і дзяржаўныя», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прапанаваў ён дапамогу беларускіх спецыялістаў у стварэнні транспартнай інфраструктуры да Ак-Сугскага горна-абагачальнага камбіната, што будуецца ў Тыве. Прэзідэнт заўважыў, што абавязаны развіваць і турыстычныя сувязі з краем.

«Перакананы, што вялікія магчымасці для ўмацавання нашага сяброўства і супрацоўніцтва таксама маюцца ў навуцы, адукацыі, культуры, інфармацыйнай сферы. Трэба больш казаць пра Тыву, каб у нас ведалі, што ёсць такая прыгажосць. Каб вы прысутнічалі ў Беларусі і Беларусь прысутнічала ў вашай інфармацыйнай прасторы», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Карыстаючыся выпадкам, ён павіншаваў тувінцаў з надыходзячым Новым годам па месяцовым календары. «Жадаю вам шчасця і дабрабыту. Мы вельмі зацікаўленыя, каб у вашым казачным, прыгожым, але няпростым краі жылі спакойна, не турбаваліся наконт рознага роду пандэмій», — сказаў Прэзідэнт.

Такім чынам ён перайшоў і да тэмы пандэміі, выказаўшы думку аб яе хуткім заканчэнні.

«Жулікі ад гэтай пандэміі кішэні набілі, пачысцілі нас добра, некаторыя дзяржавы на калені паставілі. Думаю, хутка абвесцяць аб заканчэнні. Калі сур'ёзна, то мы заўважаем, што «Амікрон» у вас ганаровым маршам ходзіць, але ён абсалютна іншы вірус, калі ўвогуле вірус. Я падазраю, што мы скаціліся да звычайнага грыпу, ён не дае пнеўманій. Кажу як чалавек, які сам другі раз — ужо гэтым «Амікронам» — перахварэў», — падзяліўся Аляксандр Лукашэнка.

Па словах кіраўніка краіны, ён хваробу «на нагах перанёс» і заўважыў толькі напрыканцы, калі зрабілі тэст. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Расіі ў пытанні барацьбы з пандэміяй і лячэння людзей узяты правільны курс — у асноўным амбулаторнае лячэнне.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## Каментарый у тэму

Працоўны візіт дэлегацыі Рэспублікі Тыва ў Беларусь працягнецца да 23 студзеня. **Кіраўнік рэгіёна Уладзіслаў ХАВАЛЫГ** запланаваў сустрэчы з прэм'ер-міністрам Раманам Галоўчанкам, старшынёй Гродзенскага аблвыканкама Уладзімірам Каранікам, наведванне Мінскага гарадскога тэхнапарка, ПВТ, МТЗ, Аршанскага льнокамбіната, малочнатаварнага комплексу «Вусценскі», тэхнічнага кластара «Вусце», комплексу «Брэміна-Орша».

Кіраўнік Рэспублікі Тыва расказаў, што па выніках размовы дамовіліся пабудаваць у рэгіёне з дапамогай беларусаў малочнатаварную ферму на 200 галоў.

«На працягу года будзе пабудаваны такі комплекс. А далей будзем тыражаваць. У нас аграрная рэспубліка, таму мы хацелі б прыярытэтам свайго развіцця зрабіць сельскую гаспадарку», — сказаў кіраўнік дэлегацыі.

Другі аспект для развіцця рэгіёна, па яго словах, — мінеральная сыравіна. Таму плануюць тувінцы прыцягнуць беларускую тэхніку да будаўніцтва здабывальных прадпрыемстваў і дарог. Магчыма, беларускія кампаніі будуць далучаны і да стварэння горна-абагачальнага прадпрыемства. З'явіліся па выніках перагавораў праекты па сумесным узвядзенні мэблевай фабрыкі ў Тыве, прадукцыя якой можа ісці на рынкі Манголіі і Кітая.

«У нас будаўнічы бум. Але не хапае рук будаўнікоў, кампетэнцый. Мы хацелі б разглядзець пытанне аб прыцягненні беларускіх будаўнікоў да ўзвядзення розных аб'ектаў. Таксама ў гэтым ключы важна абмеркаваць накіраванне беларускіх будаўнічых атрадаў на некаторыя нашы аб'екты», — заўважае Уладзіслаў Хавалыг.

Блізкая ўлада

# Выканкамы на сувязі

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 22 студзеня, з 9.00 да 12.00, праводзяць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

• старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Іванавіч КОЗЕЛ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК. Тэл. 8 015 273 56 44;

• першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Васільевіч УЛАСЕВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Дзяніс Мікалаевіч КУРЛЕНКА. Тэл. 8 017 500 41 60;

• намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

Парламенцкі дзённік

# ШМАТ НАПРАМКАЎ ДЛЯ АКТЫВІЗАЦЫІ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Каралеўства Саудаўская Аравія ў Расійскай Федэрацыі і Рэспубліцы Беларусь па сумяшчальніцтве Абдулрахманам Сулейманам аль-Ахмадам, паведаміла БелТА.**

Спікер Палаты прадстаўнікоў адзначыў, што Беларусі і Саудаўскай Аравіі неабходна развіваць гандлёва-эканамічныя адносіны, дагаворна-прававую базу, супрацоўніцтва ў міжнародных арганізацыях. «Немалую ролю, вядома, у развіцці адносін адыгрываюць і міжпарламенцкія групы дружбы, якія створаны ў нашых парламентах. Думаю, што надышоў час для таго, каб нашы групы дружбы падрыхтавалі пагадненне аб міжпарламенцкім супрацоўніцтве. Яго можна было б падпісаць падчас візіту на высокім узроўні. У цэлым хачу сказаць, што ў Беларусі і Саудаўскай Аравіі вельмі шмат напрамкаў, па якіх мы можам актывізаваць наша супрацоўніцтва. Таму мы чакаем і ад вас цікавых прапаноў, напрамкаў і ініцыятыў», — падкрэсліў ён.

У сваю чаргу, пасол дадаў, што Саудаўская Аравія таксама зацікаўленая развіваць узаемадзеянне з Беларуссю. «У дадзены момант у нас вельмі актыўная сумесная работа. У сувязі з сітуацыяй з COVID-19 у апошнія два гады мы не змаглі абмяняцца дэлегацыямі, спадзяёмся, што цяпер будзе такая магчымасць. Каралеўства Саудаўская Аравія зацікаўлена ў абмене дэлегацыямі і ў актывізацыі ўзаемаадносін у эканамічнай сферы», — адзначыў Абдулрахман Сулейман аль-Ахмад.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## МЗС Расіі абвінаваціла Захад у падрыхтоўцы правакацый супраць Украіны

**Афіцыйны прадстаўнік МЗС Расіі Марыя Захарава заявіла, што паведамленнямі аб «расійскім уварванні» краіны Захаду спрабуюць схаваць свае падрыхтоўкі да правакацый супраць Украіны.**

«Мы перакананыя, што мэта гэтай кампаніі — стварэнне інфармацыйнага прыкрыцця для падрыхтоўкі іх уласных маштабных правакацый, у тым ліку ваеннага характару, якія могуць мець самыя трагічныя наступствы для рэгіянальнай і глабальнай бяспекі», — падкрэсліла дыпламат. Паводле яе слоў, аб гэтым сведчаць апошнія паведамленні ў СМІ, на якія спасылаюцца афіцыйныя структуры і крыніцы.

«Ужо некалькі дзён Брытанія ваенна-транспартнымі самалётамі сваіх ВПС адпраўляе на Украіну зброю. Было арганізавана ўжо не менш за шэсць рэйсаў, кожнае паветранае судна можа ўзяць з сабой на борт да 77 тон грузу, гэта значыць увогуле каля 460 тон узбраенняў», — заявіла Захарава.

Апошнія месяцы ў заходніх СМІ, а таксама ва Украіне заяўляюць, што Расія нібыта рыхтуе «буйнамаштабнае уварванне» ва Украіну. У Маскве падобныя сцвярджэнні неаднаразова абвяргалі.

## У Германіі спалохаліся санкцый ЗША з-за «Паўночнага патоку — 2»

**ЗША могуць увесці санкцыі ў дачыненні да Германіі з-за расійскага праекта газаправода «Паўночны паток — 2». Такое меркаванне выказала гісторык Каця Хоер у артыкуле для The Telegraph.**

Паводле яе слоў, ФРГ цудам пазбегла санкцый з боку Вашынгтона, і гэтае пытанне па-ранейшаму стаіць на парадку дня. Гісторык лічыць, што Берлін занадта залежыць ад Масквы ў энергетычным пытанні, што не дазваляе падтрымліваць антырасійскую палітыку краін Захаду. Хоер выказала думку, што калі новы нямецкі ўрад закрые ўсе атамныя электрастанцыі ў краіне, то залежнасць Германіі ад расійскага газу ўзрасце.

У артыкуле падкрэсліваецца, што несправядліва ўсю адказнасць за сітуацыю, якая склалася, ускладаць толькі на цяперашняга кіраўніка МЗС ФРГ Аналену Бербак, былыя канцлеры Герхард Шродар і Ангела Меркель таксама шмат у чым вінаватыя.

«Першы (Шродар) запусціў «Паўночны паток — 2» і да гэтага часу старшынствуе ў камітэце яго акцыянераў. Другая (Меркель) курыравала яго будаўніцтва і паскорыла закрыццё нямецкіх АЭС», — напісала Хоер.

## Расійскі мільярдэр назваў «новае золата»

**З-за развіцця нізкавугляроднай эканомікі попыт на медзь у найбліжэйшыя гады будзе толькі расці і перавышаць прапанову. Такім чынам, гэты метал стане для свету «новай нафтай» ці нават «новым золатам». Такі прагноз у сваім артыкуле для Сусветнага эканамічнага форуму ў Давосе зрабіў расійскі мільярдэр, асноўны акцыянер групы USM Алішэр Усманаў.**

Ён растлумачыў, што гэта апраўдана спісам галін, якія непасрэдна залежаць ад медзі. Гэта тэлекамунікацыі, электрамабілі і акумулятарныя батарэі, сістэмы аднаўляльных крыніц энергіі, улоўліванне і захоўванне вугляроду.

Усманаў спаслаўся на даныя Міжнароднага энергетычнага агенцтва (МЭА), якое чакае, што да 2040 года медзь, нікель і графіт пачнуць дамінаваць у попыце на карысныя выкапні. Да таго моманту ўзровень спажывання медзі вырасце ў 2,7 раза ў параўнанні з 2020 годам.

# МЫ АБРАЛІ ШЛЯХ ПАСТУПАЛЬНА-ЭВАЛЮЦЫЙНАГА РАЗВІЦЦЯ

## Рэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова Дзяніс ДУК пра навацыі праекта Асноўнага Закона і самабытнасць беларусаў

**Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт неаднаразова станавіўся месцам правядзення адкрытых дыялогаў па абмеркаванні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю. Летась тут працавала рэгіянальная пляцоўка па пытаннях канстытуцыйнага рэфармавання і партыйнага будаўніцтва, дзе збіраліся аўтарытэтныя эксперты з усёй вобласці. Падчас Усебеларускага народнага сходу Дзяніс Дук як дэлегат і адзін з каардынатараў пляцоўкі казаў, што прыйшоў час змен. Наколькі праект новай Канстытуцыі адпавядае тым запытам, якія на яе ўскладаліся, і як можна ацаніць гэты ўстаноўчы нарматыўны дакумент з пункту гледжання гісторыка, пацікавілася ў прафесара карэспандэнт «Звязды».**



— Неабходнасць у зменах Асноўнага Закона прадыктавана жыццём, — канстатуе Дзяніс Дук. — Кіраўнік нашай дзяржавы яшчэ ў 2016 годзе ўпершыню заявіў пра тое, што наспеў час для ўнясення змяненняў у Канстытуцыю. З таго моманту гэты пасыл трансліраваўся ў грамадства. У 2020 годзе, калі дзеючы Прэзідэнт вылучаў сваю кандыдатуру на наступны прэзідэнцкі тэрмін, у сваёй перадвыбарнай праграме ён прапаноўваў унесці змены ў Канстытуцыю. Каб і далей ісці шляхам паступальна-эвалюцыйнага развіцця. Гэта не падабалася радыкальна настроеным людзям, якія заклікалі ісці шляхам рэвалюцый і вельмі моцна праявілі сябе ў негатыўным плане. На прыкладзе краін, якія перажылі каляровую рэвалюцыю, мы добра ведаем, да чаго такі шлях можа прывесці.

***— Якія з тых прапаноў, што вы агучвалі летась на Усебеларускім народным сходзе, былі пачуты?***

— Пляцоўка, якая працавала на базе ўніверсітэта, фактычна аб'яднала розныя сілы, зацікаўленыя ў пазітыўных эвалюцыйных пераўтварэннях шляхам абмеркавання, пошуку кансэнсусу на вострыя пытанні. Шэраг прапаноў, якія мы абмяркоўвалі і прапаноўвалі ў якасці пажаданняў, не ўвайшло ў праект Канстытуцыі.

Але самыя галоўныя і прынцыповыя моманты ўлічаны. Гэта пераразмеркаванне паўнамоцтваў паміж галінамі ўлады, асабліва ў дачыненні да статусу суддзяў. Пры пераразмеркаванні паўнамоцтваў паміж органамі ўлады мы звярталі ўвагу на тое, што павінен быць дакладна вызначаны статус кіраўніцтва дзяржавай у выпадку, калі Прэзідэнт страчвае дзеяздольнасць. Гэта знайшло адлюстраванне ў праекце змен Канстытуцыі. У выпадку такіх дзеянняў кіраўніцтва пераходзіць да Старшыні Савета Рэспублікі, які ўзначаліць Савет Бяспекі.

Прапаноўвалі мы таксама стварэнне новага органа кіравання — Усебеларускага народнага сходу з дакладным разгалінаваннем яго паўнамоцтваў, кірункамі дзейнасці. Мы выступалі і за тое, каб у праекце Канстытуцыі было замацавана палажэнне аб нацыянальным суверэнітэце. Гэта азначае, што Беларусь развівае добрасуседскія ўзаемаадносіны з іншымі краінамі, але на аснове сваёй самабытнасці, павагі да ўласнай гісторыі.

Ну і, вядома, такі важны момант, як захаванне гістарычнай памяці, асабліва памяці пра Вялікую Айчынную вайну. Мы бачым, па якім шляху пайшлі некаторыя краіны, якія разам з намі змагаліся супраць фашызму. Маю на ўвазе парады так званых паліцаяў, калабарантаў, якія пад рознымі лозунгамі спрабавалі і нам падмяніць гэтыя паняцці, навязаць меркаванне, што «Беларусь — краіна паліцаяў». Цяпер за такое прадугледжана нават крымінальная адказнасць.

***— У прэамбуле праекта Канстытуцыі з'явіўся новы, вельмі моцны пасыл аб неад'емным праве беларусаў на «захаванне нацыянальнай самабытнасці і суверэнітэту». У чым, на ваш погляд, заключаецца наша самабытнасць і якую сэнсавую нагрузку нясе гэта дапаўненне?***

— Мы жывём у цэнтры Еўропы на скрыжаванні культур, я нават сказаў бы, на скрыжаванні цывілізацый — заходняй і ўсходнееўрапейскай, фактычна на зоне разлому. І многія нацыі, якія апынуліся з прычыны гістарычнага лёсу на месцы цывілізацыйнага разлому, разарваныя. Народ жыве ў розных краінах, шмат канфліктаў на этнічнай глебе, канфесійнай. Нам, беларусам, гэта не ўласціва. Нам пашчасціла пазбегнуць гэтых канфліктаў.

А пашчасціла таму, што ў нас ёсць рыса гэтай самабытнасці. Мы з павагай, талерантна і адметна ставімся да нашых суседзяў, да тых народаў, якія жывуць у межах нашай краіны. І заўсёды спрабуем жыць у ладзе з рознымі канфесіямі, прадстаўнікамі розных этнасаў, і гэта трансліруецца на нашы знешнія стаўленні.

Нягледзячы на тое што беларусы жылі ў розных краінах — ВКЛ, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, мы не мелі нацыянальных форм дзяржаўнасці. Гэта былі гістарычныя формы нашай дзяржаўнасці. Нацыянальная форма дзяржаўнасці ў беларусаў пачалася з БССР, менавіта яе правапераемніцай з'яўляецца Рэспубліка Беларусь. Дарэчы, паступалі нават такія прапановы: замацаваць статус правапераемнасці БССР. Мы, стварыўшы сваю ўласную дзяржаву БССР — Рэспубліку Беларусь, захавалі вось гэта паважлівае, талерантнае стаўленне да прадстаўнікоў іншых канфесій і іншых народнасцяў, якія жывуць на нашай тэрыторыі.

Ніколі з боку нашай краіны не ішла агрэсія — ні ваенная, ні дыпламатычная, ні ментальная. І не будзе ісці. І гэта, дарэчы, замацавана ў праекце Канстытуцыі. Мы ніколі не станем агрэсарамі. Вось гэта — наша самабытнасць. У такіх умовах, знаходзячыся на разломе, мы захавалі сваю мову, культуру, традыцыі.

У прэамбуле, самай галоўнай уводнай частцы, расстаўлены ўсе акцэнты. За кожным гэтым словам дзясяткі навуковых работ. Напрыклад, за «нацыянальнай самабытнасцю» стаяць распрацоўкі беларускіх вучоных, якія адлюстраваны ў выданнях па гісторыі беларускай дзяржаўнасці і раскрываюць асаблівасці этнічнага складу нашага грамадства. Так, мы ўсе беларусы, адна нацыя, але ў нас ёсць шэраг гісторыка-культурных рэгіёнаў, якія маюць уласныя адметнасці. І гэтыя адметнасці вельмі яскравыя, і традыцыі ў кожных рэгіёнаў свае. Але мы ўсе беларусы, ёсць такія ўніверсальныя рэчы і традыцыі, якія ўсіх аб'ядноўваюць.

Калі казаць пра нашы сімвалы — сцяг і герб, — гэта вельмі моцныя прыклады самаідэнтычнасці. Разам з калегам, членам Канстытуцыйнай камісіі, рыхтуем вучэбны дапаможнік для школ і ВНУ пра гісторыю развіцця беларускай сімволікі ў часе і прасторы. Як мы прыйшлі да тых сцягу і гербу, якія маем сёння ў якасці дзяржаўных. Гэта не проста сцяг і герб, якія з'явіліся раптоўна. За імі стаіць вялікі пласт нашай культуры. Нават арнаменту на нашым сцягу некалькі тысяч гадоў, адлік пачынаецца з эпохі неаліту. Ніводная краіна сёння не зможа пахваліцца такім старажытным сімвалам. Упершыню ён быў закадзіраваны ў неалітычным арнаменце яшчэ на посудзе. Гэта сувязь зямлі з небам, калаўрот жыцця, які падкрэслівае нязменнасць усіх працэсаў, сувязь зямной і нябеснай сфер, залежнасць ад сонечнага цыкла, урадлівасці і гэтак далей. І ўсё гэта адлюстроўвае наш арнамент у той ці іншай ступені.

***— Шмат увагі ўдзяляецца тэме патрыятызму. Пошукавікі прапаноўваюць выхоўваць дзяцей на падставе ваеннай археалогіі, запрашаць іх на раскопкі, каб на канкрэтных прыкладах паказаць, наколькі крохкі мір і як важна яго берагчы і абараняць. А як яшчэ, на вашу думку, можна выхоўваць патрыётаў? І што асабіста для вас азначае гэта слова?***

— Калі сцісла, хопіць адной фразы: «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся». Можна жыць у Германіі або Польшчы, біць сябе ў грудзі і называцца патрыётам. Тады ўзнікае пытанне: «А што ты зрабіў для радзімы? Колькі разоў ты там бываеш?»

Бацькі павінны клапаціцца пра выхаванне сваіх дзяцей, падаваць прыклад сваім жыццём. Трэба цікавіцца гісторыяй, культурай, пашыраць кругагляд. У нас для гэтага ўсё створана. Паездзіце па Беларусі, павазіце з сабой дзетак, пакажыце ім, якая прыгожая і маляўнічая наша краіна, якая багатая ў яе культура. Ёсць нейкія рэперныя кропкі, якія кожны беларус павінен ведаць. Гэта Сафійскі сабор у Полацку, Мірскі замак, Ружанскі палац, Брэсцкая крэпасць, Буйніцкае поле ў Магілёве. Гэта вельмі павярхоўны аналіз, у кожным горадзе Беларусі ёсць свая адметнасць.

***— Ветэраны, у прыватнасці, каб узмацніць норму пра гістарычную памяць і гераічны подзвіг беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, прапаноўваюць замацаваць яшчэ і такое паняцце, як «праўда пра вайну». Каб не было спроб яе сказіць...***

— У нашай Канстытуцыі пазначана, што беларускі народ з'яўляецца пераможцам у вайне. Палеміка ідзе, які тэрмін выкарыстоўваць: беларускі народ або савецкі. Сэнс такі: калі пакідаем тэрмін «савецкі», значыць, прэтэндуем і на тыя краіны, якія сёння праводзяць недапушчальную для нас палітыку. У нас аднолькавы статус ушанавання гэтага подзвігу з тымі краінамі, якія сёння фактычна выціраюць ногі аб ветэранаў-чырвонаармейцаў. Мы будуем нацыянальную Канстытуцыю беларускага народа, хоць добра разумеем, што змагаліся з ворагам савецкія людзі, якія былі аб'яднаны адной краінай. Вось беларускія партызаны — гэта ўстойлівы выраз, гэта наша адметнасць. Фактычна Беларусь — краіна-партызанка. Таму мы можам абсалютна дакладна пакідаць тыя прапановы, якія знайшлі адлюстраванне. Гэта подзвіг беларускага народа. І трэба рабіць на гэтым акцэнт.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

**Вольга ЧУПРЫС:**

# «Людзі падтрымліваюць канстытуцыйныя пераўтварэнні»

**Форум аб'яднанай арганізацыі Беларускага саюза жанчын «За Беларусь» прайшоў учора ў Мінску. Работніцы лёгкай прамысловасці з розных куткоў краіны паўдзельнічалі ў насычанай праграме, адным з важных этапаў якой стаў дыялог па праекце новай Канстытуцыі. Спікерамі сталі намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Вольга Чупрыс, якая ўдзельнічала ў распрацоўцы праекта, старшыня канцэрна «Беллегпрам» Таццяна Лугіна, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы Марына Лянчэўская, дырэктар і мастацкі кіраўнік Нацыянальнай школы прыгажосці, член Канстытуцыйнай камісіі Бажэна Ярэміч.**

— На апошняй нарадзе па Канстытуцыі Прэзідэнт адзначыў, што падобная работа па абмеркаванні праекта, як у Беларусі, не праводзілася нідзе, і гэта так і ёсць, — адзначыла Вольга Чупрыс. — Удзел у абмеркаванні ўзяла вялікая колькасць грамадзян. На папярэднім этапе Канстытуцыйная камісія адразу атрымала больш за тысячу прапаноў, яны ўсе ўважліва абмяркоўваліся. Затым на дыялогавых пляцоўках і іншых сустрэчах мы атрымалі яшчэ каля 15 тысяч прапаноў. Прэзідэнт прыняў рашэнне накіраваць праект на ўсенароднае абмеркаванне, і за тры з паловай тыдня было атрымана яшчэ каля васьмі тысяч водгукаў. Большасць з іх станоўчая, што сведчыць аб тым, што людзі ў асноўным падтрымліваюць тыя канстытуцыйныя пераўтварэнні, якія мы распачалі, прычым распачаў іх сам народ, які адчуваў неабходнасць перамен.

Пытанні ўдзельніц форуму датычыліся самых розных аспектаў, у тым ліку новага органа ўлады — Усебеларускага народнага сходу, што мусіць з'явіцца паводле праекта. Яго ролю, колькасць членаў і колькі гэта будзе каштаваць бюджэту краіны растлумачыла Вольга Чупрыс. Яна адзначыла, што сённяшні парламент выконвае заканадаўчую і прадстаўнічую функцыю, з-за чаго на яго работу часам узнікаюць нараканні. Парламент усё ж павінен займацца заканатворчай дзейнасцю, а прадстаўнічую функцыю возьме на сябе УНС. Мяркуецца, што яго дэлегатамі будуць 1200 беларусаў — ад Прэзідэнта, суддзяў і дэпутатаў да кіраўнікоў прадпрыемстваў і простых рабочых.

— Колькі гэта будзе каштаваць? Амаль нічога, бо ўсе члены УНС будуць працаваць на грамадскіх пачатках, — адзначыла Вольга Чупрыс.

Удзельніц хвалявала і знікненне з Канстытуцыі нормы пра нейтралітэт нашай дзяржавы. Ці не стане гэта нагодай накіроўваць нашых вайскоўцаў у гарачыя кропкі?

— Беларусь заўсёды была мірнай краінай, з гэтага нават пачынаецца наш гімн. І я, як матуля двух сыноў, магу сказаць, што нараджала іх для мірнага жыцця, — адказала Марына Лянчэўская. — Нашы міратворчыя сілы нядаўна былі накіраваны ў Казахстан, але не зрабілі там ніводнага выстралу, затое гэта мела псіхалагічны эфект.Таму мы ў выпадку неабходнасці гатовы абараняць граніцы нашай краіны, але Беларусь — мірная дзяржава.

Навошта ў Канстытуцыю дадаюць артыкул пра моладзь? На гэта адказала Бажэна Ярэміч:

— Для мяне і, думаю, для ўсіх маладых людзей вельмі важна і значна ўключэнне ў новую Канстытуцыю артыкула, які замацоўвае норму, што дзяржава ўсебакова падтрымлівае моладзь, дапамагае яе развіццю, а мы, моладзь, мусім дзяліцца нашым патэнцыялам, крэатывам і рабіць усё магчымае для развіцця нашай дзяржавы.

Таццяна Лугіна падвяла вынік сустрэчы, адзначыўшы, што ўдзельніцы атрымалі адказы з першых вуснаў, у тым ліку ад распрацоўшчыкаў Канстытуцыі.

— Усе ўдзельніцы прыехалі з розных куткоў краіны, з абласных і раённых цэнтраў, і хочацца, каб гэтыя адказы яны данеслі да сваіх калектываў і дзесьці ў размовах за жыццё маглі аргументавана расказаць і абмеркаваць тэму новай Канстытуцыі. Самае галоўнае — мы застанемся той дзяржавай, дзе першарадная роля адведзена чалавеку, і дзяржава клапоціцца пра яго. Наша сацыяльная арыентаванасць, магчыма, не ўсім зразумелая ў свеце, а мы гэтым ганарыліся і будзем ганарыцца, — рэзюмавала Таццяна Лугіна.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Беларусы расчараваліся ў доларах

**Па выніках года наша насельніцтва не толькі значна астыла да гэтай валюты, але і працягвае пазбаўляцца ад яе рэкорднымі тэмпамі**

**Менавіта да такіх высноў прыйшлі спецыялісты грамадскай арганізацыі «Усе банкі Беларусі». Чым жа запомніўся ў плане валютных плыняў і ваганняў мінулы год? Спачатку па гарачых слядах успомнім усе рэкордныя фінансавыя паказчыкі. Па-першае, фізічныя асобы ў снежні мінулага года прадалі банкам краіны 1 мільярд 76,3 мільёна долараў, што перавысіла продажы ў снежні годам раней на 288,3 мільёна долараў і стала чарговым гістарычным максімумам.**

## За мінулы год насельніцтва стала чыстым прадаўцом валюты ў аб'ёме амаль 54 мільёнаў долараў

Дарэчы, продаж валюты трымаецца на высокім узроўні ўжо некалькі месяцаў. У лістападзе насельніцтва рэалізавала валюты на 4,3 млн долараў менш, чым у снежні. Гэта паказвае на істотнае змяненне стаўлення жыхароў краіны да валютных зберажэнняў. Многія расчараваліся ў гэтай валюце, што тлумачыцца, відаць, значнай даларавай інфляцыяй — некаторыя тавары, якія не ўваходзяць у склад тавараў першай неабходнасці, падаражэлі за год у доларах на дзясяткі працэнтаў.

У параўнанні з лістападам насельніцтва купіла валюты ў снежні мінулага года на 79,3 мільёна долараў больш, а ў параўнанні са снежнем 2020 года — на 26 мільёнаў долараў больш. Як адзначаюць эксперты Нацбанка, павелічэнне попыту на валюту з'яўляецца ў значнай ступені традыцыйнай з'явай для канца года.

Такім чынам, жыхары краіны ў снежні мінулага года рэалізавалі валюты больш (на 31,4 мільёна долараў), чым набылі. Усю другую палову года яны прадавалі валюту, хоць у першай палове года куплялі. У выніку за год яны аказаліся чыстымі прадаўцамі валюты ў аб'ёме 53,4 мільёна долараў.

## Арганізацыі прадаюць валюты яшчэ больш, але не ў снежні

Па статыстыцы Нацбанка, суб'екты гаспадарання — рэзідэнты нашай краіны ў мінулым годзе прадавалі валюту яшчэ больш актыўна, чым фізічныя асобы. У снежні 2021 года яны рэалізавалі яе на 2,762 мільярда долараў, што перавысіла продаж у снежні 2020 года на 555,1 мільёна долараў і стала чарговым гістарычным рэкордам. У параўнанні з лістападам мінулага года продаж вырас на 430 мільёнаў долараў.

Але куплялі ў канцы года валюту больш актыўна, чым прадавалі. Попыт на валюту з боку беларускіх прадпрыемстваў у снежні мінулага года вырас на 411 мільёнаў долараў у параўнанні з лістападам таго ж года і дасягнуў 2,845 мільярда долараў. За год купля валюты павялічылася на 607,2 мільёна долараў.

У выніку беларускія прадпрыемствы купілі валюты за снежань на 83,5 мільёна долараў больш, чым прадалі. Але за год яны, тым не менш, засталіся чыстымі прадаўцамі валюты, рэалізаваўшы яе на 678,9 мільёна долараў больш.

## Нерэзідэнты і банкі таксама валюту прадаюць

Суб'екты гаспадарання — нерэзідэнты летась таксама рэалізавалі валюты больш, чым купілі: на 529,3 мільёна долараў. У снежні яны прадалі валюту на 45,7 мільёна долараў у чыстым выражэнні. У дадзенай сітуацыі няма нічога дзіўнага, так як нерэзідэнты стабільна прадаюць валюту на працягу ўсяго года.

Чыстымі прадаўцамі валюты ў 2021 годзе аказаліся і банкі з фінансавымі арганізацыямі. Яны рэалізавалі яе на 151,1 мільёна долараў больш, хоць у снежні банкі былі чыстымі пакупнікамі валюты і набылі яе на 19,7 мільёна долараў. Пры гэтым яны актыўна прадавалі валюту вясной і летам мінулага года, калі яна таннела. Што тэксама нядзіўна: банкі зараблялі сабе прыбытак.

## Краіна функцыянуе са значным плюсам

З'явіліся даныя па знешнім гандлі за 11 месяцаў мінулага года. І гэта новыя рэкорды, калі станоўчае сальда амаль 4 мільярды долараў. Па выніках студзеня — лістапада мінулага года сальда знешняга гандлю Беларусі таварамі і паслугамі дасягнула новага значэння — 3,978 мільярда долараў, перавысіўшы сальда за аналагічны перыяд 2020 года ў два разы.

Сальда знешняга гандлю таварамі толькі крыху не дацягнула да дадатнага значэння і склала мінус 120 мільёнаў долараў, тады як за 11 месяцаў мінулага года яно раўнялася мінус 1,47 мільярда долараў. Ёсць шанцы, што сальда па выніках усяго 2021 года акажацца станоўчым.

Пры гэтым экспарт тавараў, па даных Нацыянальнага банка, у студзені — лістападзе 2021 года вырас на 38,5 % і дасягнуў 35,3 мільярда долараў, у той час як імпарт вырас са значна меншымі тэмпамі, на 31,4 % — да 35,4 мільярда долараў.

Стан знешняга гандлю паслугамі ў мінулым годзе таксама палепшыўся, хоць і не так значна, як таварамі. Паводле звестак Нацбанка, экспарт паслуг у гэты час вырас на 17,7 % і дасягнуў 9,21 мільярда долараў, а імпарт вырас на 17,3 % — да 5,11 мільярда долараў. У выніку сальда знешняга гандлю паслугамі павялічылася да плюс 4,098 мільярда долараў. У цэлым аб'ём знешняга гандлю таварамі і паслугамі нашай краіны за 11 месяцаў мінулага года дасягнуў 85,09 мільярда долараў, перавысіўшы аб'ём за студзень — лістапад 2020 года на 31,6 %.

Лістапад жа мінулага года аказаўся найлепшым месяцам для знешняга гандлю таварамі летась. Экспарт тавараў склаў 4,204 мільярда долараў і перавысіў экспарт у лістападзе 2020 года на 1,548 мільярда долараў. У параўнанні з кастрычнікам 2021 года экспарт тавараў у лістападзе гэтага ж года вырас на 496,2 мільёна долараў.

Экспарт паслуг у лістападзе мінулага года вырас у параўнанні з кастрычнікам на 20,8 мільёна долараў і дасягнуў 860,9 мільёна. Гэта на 100,8 мільёна больш, чым у лістападзе 2020 года. Добры вынік, улічваючы праблемы, якія ўзніклі з транспарціроўкай расійскага газу па газаправодзе «Ямал-Еўропа».

Сумарнае сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі нашай краіны ў лістападзе 2021 года дасягнула 787,8 мільёна долараў, перавысіўшы сальда за лістапад 2020 года на 622,4 мільёна. У гісторыі Беларусі падобных дасягненняў яшчэ не было.

## Золатавалютныя рэзервы ў мінулым годзе выраслі амаль на мільярд долараў. За кошт чаго?

Нягледзячы на праблемы з новымі запазычаннямі за мяжой у сувязі з санкцыямі шэрагу заходніх краін супраць Беларусі, золатавалютныя рэзервы ў 2021 годзе выраслі на 956,5 мільёна долараў — да 8,425 мільярда.

Гэта нашмат перавысіла чаканні ўрада краіны, які ў канцы 2020 года запланаваў магчымае скарачэнне рэзерваў да 6 мільярдаў долараў. Як паведамілі ў Нацыянальным банку, што ён сумесна з урадам у 2021 годзе выканаў знешнія і ўнутраныя абавязацельствы ў валюце на суму каля 3,1 мільярда долараў. Пры гэтым у снежні мінулага года золатавалютныя рэзервы знізіліся ў параўнанні з лістападам на 44,1 мільёна долараў (на 0,5 %). А выдаткі ўрада і Нацбанка на выплаты па абавязацельствах склалі 220 мільёнаў долараў.



Кошт манетарнага золата, якое ўваходзіць у склад рэзерваў, у снежні павялічыўся на 30,3 мільёна долараў — да 3,123 мільярда долараў. За год дадзены кошт павялічыўся ўсяго на 81,5 мільёна. Сціплы вынік тлумачыцца параўнальнай стабільнасцю цэн на золата на сусветным рынку. Рэзервовыя актывы краіны ў замежнай валюце ў 2021 годзе павялічыліся на 884,7 мільёна долараў — да 3,845 мільярда.

Ураду дапамаглі ў асноўным прадпрыемствы, даходы якіх ад экспарту значна выраслі. Акрамя таго, валюту краіне прадавалі фізічныя асобы, а таксама банкі і фінансавыя арганізацыі.

Мінфіну ўдалося размясціць на ўнутраным рынку валютных аблігацыі на 903,5 мільёна долараў у чыстым выражэнні. Такім чынам, для пагашэння знешняга дзяржаўнага доўгу ў мінулым годзе ўрад выкарыстоўваў у асноўным сродкі насельніцтва і прадпрыемстваў.

## Што чакае рубель заўтра?

Беларускі рубель, насуперак усім негатыўным прагнозам, умацоўваўся ўвесь 2021 год. Многія эксперты, бачачы гэта, паўтаралі пра тое, што мяжа ўмацавання нацыянальнай валюты дасягнута і да канца года замежныя грашовыя адзінкі адыграюць значную частку свайго падзення. Але і гэтага не адбылося.

Так званыя незалежныя аналітыкі прагназавалі, што Нацбанк уключыць друкарскі станок. Але гэтага не адбылося, як не адбылося і павышэння стаўкі рэфінансавання, якая напрамую ўплывае на стан фінансавага рынку.

Айчынныя эксперты нагадваюць нам, што ў апошні раз гэта стаўка змянялася ў ліпені мінулага года, тады яна была павялічана да 9,25 працэнтнага пункта.

Варта адзначыць, што за ўсю гісторыю суверэннай Беларусі самая нізкая стаўка рэфінансавання была вызначана ў ліпені 2020 года на ўзроўні 7,75 %, а самая высокая — у снежні 1994 года на ўзроўні 480 %.

Верагоднасць, што стаўка будзе павышана ў пачатку гэтага года, высокая. Такія варыянты магчымыя. Акрамя таго, на такі крок можа штурхнуць і становішча сусветнай фінансавай сістэмы. Сусветныя банкі і рэгулятары выказаліся за ўзмацненне жорсткасці манетарнай палітыкі, і расійскі Цэнтрабанк і ФРС Амерыкі цалкам могуць пайсці на павышэнне стаўкі рэфінансавання.

«Зыходзячы з 9,25 цяперашняга працэнтнага пункта, павелічэнне да 10 % (гэта значыць супастаўна з інфляцыяй) вельмі верагодна, і гэта не будзе дзіўна», — прагназуюць эксперты сітуацыю ў нас.

Наогул, увесь свет, уся фінансавая сістэма, будзе рабіць больш жорсткай манетарную палітыку. Прайшло два гады з пачатку пандэміі. Было «намалявана» сумарна каля 6,5 трыльёна долараў. І пакуль рынак не абсарбіруе ўсю гэтую масу — усё яшчэ больш-менш нармальна, але як толькі гэта здарыцца, то амерыканцы са сваёй рэзервовай сістэмай пойдуць на стаўкі. Яны ўжо скарачаюць праграму выкупу аблігацый. І калі ў іх інфляцыя да лета застанецца такой жа — а яна ў іх цяпер 6,8 %, чаго не было з 1982 года, — то павышэнне стаўкі рэфінансавання ў ЗША будзе непазбежна.

Фінансісты гэтай краіны хацелі разагнаць інфляцыю, але не так моцна. А ў выніку пераскочылі свае кантраляваныя 2 % і сышлі далей, а цяпер у іх задача — збіць яе. На думку эканамістаў, для амерыканцаў павышэнне стаўкі — гэта апошняе, да чаго яны хочуць звяртацца. Таму што з ростам стаўкі аўтаматычна расце цана абслугоўвання доўгу. У ЗША велізарны дзяржаўны доўг, а нядаўна яго верхняя мяжа была ўзнята да 32 трыльёнаў. І ўсё гэта трэба абслугоўваць, для чаго прыйдзецца павышаць падаткі, таму што іншай крыніцы папаўнення бюджэту ў іх няма. Але як толькі яны пачнуць рабіць больш жорсткімі фіскальную палітыку — простыя амерыканцы ўзвыюць, а няпростыя амерыканцы ў выглядзе мільянераў і мільярдэраў пачнуць чухаць галаву і задавацца пытаннем: «А каго мы выбралі ў сенат і ў кангрэс?»

Умацаванню беларускага рубля ў 2021 годзе сур'ёзна дапамог рост экспартных паставак айчыннай сыравіны. Валютная сістэма захоўвае стабільны стан. Гэта сведчыць аб тым, што нацвалюта стабільная, адчувае сябе добра. Асноўная прычына такой устойлівасці яшчэ і ў тым, што Нацбанк захоўвае шырокую грашовую масу ў досыць вузкім калідоры.

Па словах фінансавых аналітыкаў, на валютным рынку таксама склалася добрая сітуацыя. Дзённыя аб'ёмы па продажы валюты ў канцы 2021 года знаходзіліся ў межах 18—30 мільёнаў долараў, што паказвае на стабільны баланс попыту і прапановы па валюце.

Дрэнна, калі аб'ёмы нізкія — гэта значыць, ніхто валюту не прапануе. Ці калі аб'ёмы велізарныя, як у 2020 годзе, пад 100 мільёнаў долараў на працягу гандлёвай сесіі. Таму знаходжанне ўсіх параметраў у вузкім калідоры і стварае стабільнасць унутранага рынку.

Прагназаваць інфляцыю беларускага рубля на сёлета вельмі складана. Асабліва на ўсе 12 месяцаў. Аднак ёсць перадумовы да таго, што паступова яна будзе тармазіць. З вялікай доляй верагоднасці яна паступова будзе зніжацца. Але калі менавіта — сказаць складана. Па меры сыходу пандэміі, вакцынацыі пачнецца рост сусветнай эканомікі, інфляцыя пойдзе плаўна ўніз, у тым ліку і ў Беларусі», — адзначаюць эксперты.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Дарэчы**

## Дацкія фінансавыя аналітыкі прагназуюць палітычны крызіс у ЗША і падзенне курсу долара

Дырэктар па інвестыцыях Saxo Bank Сцін Якабсан, які і з'яўляецца аўтарам прагнозу, заявіў, што галоўная тэма ў ЗША на 2022 год — рэвалюцыя ў грамадстве і эканоміцы, якія пакутуюць ад нэрвоўнасці. Ён лічыць, што рэвалюцыя непазбежная, толькі незразумела, калі яна адбудзецца.

Тым не менш прадказанні Сціна Якабсана былі даволі канкрэтныя. У прыватнасці, ён лічыць, што новы Кангрэс ЗША ў пачатку 2023 года не зможа пачаць пасяджэнні з 3 студзеня, бо паўстануць праблемы з пацвярджэннем канчатковых вынікаў выбараў у сенат і палату прадстаўнікоў, якія адбудуцца ў 2022 годзе.

З падлікам галасоў на гэтых выбарах паўстануць тыя ж праблемы, што і на выбарах прэзідэнта ЗША ў 2020 годзе, і вынікі выбараў не будуць прызнаныя. У краіне паўстане канстытуцыйны крызіс.

Гэта, як лічыць Сцін Якабсан, прывядзе да росту даходнасці казначэйскіх аблігацый ЗША, а курс долара ўпадзе. Больш за тое, ён мяркуе, што інфляцыя ў ЗША ў канцы 2022 года перавысіць 15 %, хоць і па іншай прычыне. Аналітык мяркуе, што Федэральнае агенцтва гэтай краіны зробіць памылку, прамаруджыўшы з узмацненнем жорсткасці сваёй грашовай палітыкі, і заработная плата насельніцтва ЗША да канца года вырасце на 15 %, што прывядзе і да росту інфляцыі вышэй за дадзены ўзровень.

Малая радзіма

# ПА ІНІЦЫЯТЫВЕ ЖЫХАРОЎ

## У Зэльвенскім раёне аднаўляюцца паркі былых княжацкіх сядзіб

**Калі раней сродкі на падобныя праекты шукалі ў міжнародных арганізацыях, то цяпер мясцовыя жыхары спадзяюцца больш на сябе. Напрыклад, сродкі на добраўпарадкаванне старажытнага парку ў Дзярэчыне выдзяляюцца з нядаўна створанага абласнога фонду грамадзянскіх ініцыятыў.**

### Аграгарадок Князева. Як стары парк стаў мясцовай славутасцю

Да аднаўлення парку тут прыступілі некалькі гадоў таму.

— Было крыху страшна, — прызнаўся падчас шпацыру **старшыня Крамяніцкага сельвыканкама Аляксандр ДЗЕРАЧЭНІК.** — Бо парк даволі моцна зарос непралазнымі кустамі, амаль канчаткова згубіў сваю ўнікальнасць, хоць некалі славіўся і рэдкімі раслінамі, і дрэвамі, і прыгожым вадаёмам.

Закладваў яго роўна 150 гадоў таму адстаўны генерал Жураў, які атрымаў тут сядзібу. У парку засталася частка каменнай гаспадарчай пабудовы тых часоў. Але не толькі. Галоўнае, што засталіся старыя дрэвы: чырвоны дуб, канадскі клён, піхты, ліпы, хвойкі Сасноўскага. Гэта зараз яны выглядаюць велічна, а тады з-за хмызняку на іх мала звярталі ўвагі.

Кіраўнік мясцовай адміністрацыі ўдакладняе: «Вельмі хацелася вярнуць парку прыгожы выгляд. Важна было таксама добраўпарадкаваць тут сучасную зону адпачынку — і для аматараў актыўнага ладу жыцця, і для сустрэч з сябрамі. Таксама ўлічвалі і сем'і з дзецьмі».

Прапанавалі сацыяльны праект на конкурс, які быў арганізаваны грамадскім аб'яднаннем, атрымалі грант у памеры пяці тысяч долараў. Сума невялікая, зазначыў Аляксандр Дзерачэнік. Гэтыя сродкі дазволілі толькі пачаць работы, а восць асноўныя, у тым ліку фінансавыя намаганні, узяла на сябе сельгасгаспадарка «Князева». Далучыліся і самі месцічы. Усе альтанкі, лаўкі рабілі ўласнымі сіламі, каб было танней. Прычым і сам старшыня сельвыканкама не стаяў убаку — працаваў у сталярнай майстэрні разам з іншымі апантанымі вяскоўцамі.



— Тое, што мы задумалі, можна сказаць, за два гады здзейснілі. На сёння парк становіцца любімым месцам адпачынку ўсяго наваколля. Моладзь збіраецца каля альтанак. Тут устаноўлены мангалы для шашлыкоў. Уздоўж прыбярэжнай паласы праведзена электрычнае асвятленне. Для аматараў спорту ёсць валейбольная пляцоўка. Летам можна здзейсніць водную прагулку на катамаране. Абсталяваны дзіцячы гульнявы гарадок. Для правядзення культурна-масавых мерапрыемстваў устаноўлена сцэна, — распавядае суразмоўца і звяртае ўвагу на гравійную дарожку, якая пракладзена мясцовым сельскагаспадарчым філіялам.

У далейшых планах — заасфальтаваць галоўныя сцежкі. І тут не абысціся без дапамогі філіяла «Князева». Старшыня сельвыканкама ўдакладняе: гаспадарка многа зрабіла. Яе ўклад у некалькі разоў перавышае памеры гранта. Каб гэтага не адбылося, наўрад ці парк стаў бы такім прывабным, у тым ліку і для ўрачыстых мерапрыемстваў, напрыклад мясцовых Дажынак. Менавіта тут шанавалі ўдзельнікаў мінулага жніва на раённым фестывалі хлебаробаў. Пасля свята, дарэчы, з'явілася нямала новых скульптур, якія зрабіла на конкурс кожная гаспадарка. Парк і надалей будуць папаўняць малыя архітэктурныя формы.

Аляксандр Дзерачэнік не хавае роспачы з прычыны некаторых выпадкаў пашкоджання грамадскай маёмасці. Бывае, што і альтанку зламаюць, і мангал, смецце пасля сябе пакінуць, хоць побач стаяць сметніцы, ёсць і адпаведныя кантэйнеры.

— З цягам часу такіх выпадкаў назіраецца ўсё менш, — зазначае старшыня сельвыканкама. — Мясцовыя жыхары імкнуцца да парадку ў паркавай зоне. У асноўным усё праходзіць цывілізавана. Людзі разумеюць, што калі штосьці паламаюць, значыць, не змогуць больш тут адпачыць. І чысціню пакінуць пасля сябе магчыма.

У далейшых планах — зрабіць экалагічную сцежку. У наваколлі нямала рэліктавых дрэў, падарожжа да якіх абяцае быць цікавым. Адно з такіх расце і ў самім парку — канадскі вяз. Мала таго што ён вельмі стары, мабыць, яшчэ з часоў закладкі парку, дык мае незвычайную форму. Яго тоўсты ствол нібы пастаўлены на роўна зрэзаны пень, а ў вышыні раздзяляецца надвое. Вось такі цуд прыроды.

### Аграгарадок Дзярэчын. На пачатку аднаўлення

Калі князеўцы ўжо карыстаюцца сваім адроджаным паркам, то дзярэчынцы толькі прыступаюць да справы вяртання колішняй славутасці. У іх таксама былі спадзяванні на грант, бо праект «Адраджэнне Сапегаўскага парку» перамог у еўрапейскім конкурсе. Гэта было год таму, але фінансаванне так і не пачалося — праект спынілі. Можна зразумець расчараванне адміністрацыі Дзярэчынскага сельвыканкама і ўсіх месцічаў, якія спадзяваліся пераўтварыць пустку ў камфортную зону адпачынку, абсталяваць веласіпедную дарожку, культурную і дзіцячыя зоны.

І ўсё ж мясцовая ініцыятыва не загінула. Праект па добраўпарадкаванні Сапегаўскага парку стаў пераможцам конкурсу ў рамках Гродзенскага абласнога фонду грамадзянскіх ініцыятыў. Гэта новае фарміраванне, створанае Асацыяцыяй мясцовых Саветаў дэпутатаў пры абласным Савеце. Праект па аднаўленні парку Сапегаў аказаўся ў ліку 14 пераможцаў конкурсу. А ўсяго было пададзена 104 заяўкі.

Па словах **старшыні Дзярэчынскага сельвыканкама Аляксандра БЕЛЯКАЛЫ,** да рэалізацыі праекта гатовы падключыцца мясцовыя актывісты. Партнёрам выступіць сельгаспрадпрыемства «Галынка». Канцэпцыя парку застаецца такой, як і планавалася напачатку.

Першыя крокі ўжо зроблены. Тэрыторыя зоны адпачынку пазбаўлена смецця, сухастою, аварыйных дрэў і старых пнёў. Майстры пачалі работу па вырабе лавак і альтанак, якія будуць стаяць па перыметры парку. Упрыгожаць зону адпачынку драўляныя скульптуры. Прыкладаюцца ўсе намаганні, каб стварыць тут утульны куток адпачынку для месцічаў і турыстаў.

А нагод для наведвання аграгарадка нямала. Яго гісторыя цесна звязана з родам Сапегаў, магутнымі і ўплывовымі магнатамі. Тут была адна з іх галоўных рэзідэнцый, таму Дзярэчын у XVII стагоддзі нават называлі беларускім Версалем. Каля палаца быў разбіты сад і парк у выглядзе трох тэрас. Уздоўж шырокіх алей раслі каштаны і таполі.

— Справа не ў тым, каб вярнуць прыродна-гістарычнаму аб'екту былы выгляд, — зазначае старшыня сельвыканкама. — Такая задача не стаіць, бо зараз іншыя патрэбы. Нам важна, каб людзі мелі камфортны куток прыроды для адпачынку — як для душы, так і для цела. Таму мяркуем абсталяваць спартыўныя пляцоўкі з трэнажорамі. Іх, дарэчы, плануем закупіць за кошт гранта, які атрымалі ў абласным конкурсе грамадзянскіх ініцыятыў. Сума складае 7 тысяч рублёў.

Асноўныя работы будуць весціся вясной. Тады ж пачнецца і мантаж усіх запланаваных аб'ектаў. У перспектыве — высадка тэматычных алей, у тым ліку ў гонар знакамітых жыхароў Дзярэчына, працоўных дынастый, якія зрабілі важкі ўнёсак у развіццё малой радзімы. Па словах Аляксандра Белякалы, мясцовыя жыхары гатовы сумеснай працай вырашаць праблемы па добраўпарадкаванні свайго аграгарадка. На думку старшыні, гэта не толькі ўзнімае настрой, але і паляпшае якасць жыцця, садзейнічае развіццю мясцовых тэрыторый.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

---

Вакцынацыя

# ПАСПЕЦЬ ДА «АМІКРОНА»

## Колькасць прыхільнікаў прышчэпкі расце ў Брэсце і Брэсцкай вобласці

**Тое, што ўсё больш людзей прыходзіць у прышчэпачныя пункты — добра. Дрэнна, што даволі шмат суайчыннікаў супакоілася і пачала ігнараваць штодзённыя элементарныя меры перасцярогі. Днямі ў маршрутцы разыгралася характэрная сцэна. Адна пасажырка другой зрабіла заўвагу, што апошняя заходзіць у транспарт без маскі.**

Тая, што не пажадала хаваць пад маскай яркую памаду, стала ў позу: «А па тэлевізары сказалі, што маскі неабавязкова насіць». На што апанентка спакойна адказала: «Вось і глядзіце свой тэлевізар без маскі, а побач з намі, калі ласка, захоўвайце рэспіраторны этыкет» і не пасунулася, каб вызваліць ёй вольнае месца. Пасля гэтага спачатку ваяўніча настроенай кабеце нічога не заставалася, як знайсці ў кішэні маску ды начапіць. Відавочна, што людзі трошкі прывыклі да ковіду, супакоіліся і страцілі пільнасць: таўкуцца ў чарзе да касы, не лічаць патрэбным асцерагацца ў транспарце, у іншых грамадскіх месцах. І дарэмна.

Хварэюць не столькі, вядома, як раней, але хварэюць. Да таго ж медыкі папярэджваюць пра хуткую новую хвалю, якую прынясе каварны «Амікрон». І адзіным дзейсным папярэджаннем цяжкага ходу хваробы па-ранейшаму называецца вакцынацыя. Пра гэта не стамляецца нагадваць сваім падпісчыкам у тэлеграм-канале **старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК.** Паводле інфармацыі мэра, перад Новым годам быў пераадолены рубеж у 50 працэнтаў імунізацыі жыхароў горада супраць COVID-19. Да пачатку лютага плануецца ахапіць прышчэпкамі 60 працэнтаў насельніцтва, у тым ліку прышчапіць 75 працэнтаў грамадзян з групы рызыкі.



На адным з прышчэпачных пунктаў у Брэсце.

Варта адзначыць, што ў абласным цэнтры ўжо прышчэплена 94 працэнты медыцынскіх работнікаў, 79 — работнікаў сістэмы ЖКГ, энерга- і водазабеспячэння, 71 — супрацоўнікаў устаноў адукацыі, 69 — сферы культуры і спорту.

Кіраўнік горада ўказвае на рэзервы, дзе, паводле яго меркавання, вакцынацыя ідзе даволі слаба. Гэта сфера бытавога абслугоўвання, транспарту, гандлю і грамадскага харчавання.

Як паведаміў **галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Брэста і Брэсцкага раёна Генадзь РАДЧАНКА**, у Брэсце, як і ва ўсёй краіне, пачалася імунізацыя дзяцей і падлеткаў ад 12 да 17 гадоў. Для гэтага прымяняецца кітайская вакцына Vero Cell. Па стане на сярэдзіну месяца ў Брэсце і Брэсцкім раёне прышчэплена каля 470 падлеткаў. Пачынаецца работа выязных пунктаў вакцынацыі ў школах і гімназіях, дзе на базе школьных медпунктаў вучні змогуць прышчапіцца цэлымі класамі. Папярэдне праводзіцца вялікая асветніцкая работа з прыцягненнем педагогаў і бацькоў. На сходах даводзіцца інфармацыя аб прышчэпліванні падлеткаў як спосабе абараніць у тым ліку дарослае насельніцтва. Дзеці, як вядома, вызначаюцца павышанай камунікабельнасцю, таму нярэдка і выступаюць разносчыкамі інфекцыі, тым чынам падвяргаючы небяспецы многіх дарослых, у тым ліку сваіх пажылых сваякоў. Таму вельмі важна сфарміраваць імунітэт у дзяцей школьнага ўзросту.

Паводле інфармацыі Брэсцкага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, на Брэстчыне прышчэплена звыш 54,5 працэнта насельніцтва. Тэмпы не зніжаюцца, штодзень у рэгіёне вакцынацыю праходзіць каля 10 тысяч чалавек. Але ж для дасягнення калектыўнага імунітэту патрэбна не менш за 60 працэнтаў прышчэпленых, нагадваюць медыкі. Да гэтай лічбы важна наблізіцца да пачатку новай хвалі.

І хоць працэс паступова і настойліва прасоўваецца, у кожным горадзе, кожным раёне даводзіцца чуць пра катэгарычных праціўнікаў прышчэпкі. Вядома, кожны чалавек гэтае пытанне вырашае для сябе сам. Толькі ім, праціўнікам прышчэпак, я параіла б звярнуцца да статыстыкі па краінах і кантынентах. Усе даволі багатыя і развітыя краіны цяпер набліжаюцца да поўнай імунізацыі. Скажам, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты маюць 98 працэнтаў прышчэпленых жыхароў, Кітай — 87, ЗША — 74, Аўстралія — 80, Ізраіль — 71. Ёсць, вядома, і іншыя падыходы і лічбы. Ну, напрыклад, у Камеруне прышчэпку атрымалі 3 працэнты жыхароў, у Замбіі — 4, у Буркіна-Фасо — 5. Але ці варта на іх арыентавацца?

Нядаўна давялося прачытаць, што вядомы грып «іспанку» пераадолелі без усялякіх прышчэпак. Яно так, але ж не трэба забываць і пра мільёны ахвяр пандэміі стагадовай даўнасці. Да таго ж цалкам верагодна дапусціць, што людзі тады былі мацнейшыя за сучаснікаў, бо натуральны адбор у тыя часы працаваў з-за шэрагу прычын больш актыўна і жорстка. Але і сёння кожны з нас можа назваць сярод знаёмых, сваякоў, калег, суседзяў па доме тых, што сталі ахвярамі пандэміі. Таму варта хапацца за ўсе магчымыя сродкі аховы і прафілактыкі — і не ігнараваць элементарныя штодзённыя меры засцярогі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара.**

# «ЗЯЛЁНЫЯ КРОКІ» ДА ТУРАВА ДАВЯДУЦЬ



Настаўніца СШ № 2 г. Турава Таццяна ЗЯМЛЯНІК (*у цэнтры*) з вучнямі восьмага класа.

## Колер настрою — зялёны

Таццяна Мікалаеўна ўсё жыццё жыве і працуе ў родным Тураве. Амаль 25 гадоў штодня ў акружэнні больш як сотні дзяцей. Акрамя выкладання ў Тураўскай сярэдняй школе № 2 у якасці настаўніка-прадметніка, сапраўды захапляецца вядзеннем класнага кіравання ў сваім восьмым класе. Арганізуе Таццяна Зямлянік і заняткі паводле інтарэсаў для школьнікаў старэйшых класаў па суботах.

— Тры гады таму, калі набрала пяцікласнікаў, вырашыла актыўна далучаць дзяцей да экалагічнага выхавання. Бо экаследам сама даўно цікаўлюся. Я аматар гарадскога веларуху, адказная падыход да раздзельнага збору смецця, падкантрольнага спажывання ўсіх даброт сучаснасці, — дзеліцца настаўніца. — З дзецьмі ў класе мы спачатку крэатыўна падышлі да збору макулатуры, бо менавіта ў школе штодня выкідваюцца стосы спісаных сшыткаў.

Дамовіліся, што разам будзем ісці да пастаўленай мэты — назбіраць норму па макулатуры — і пазначаць усе свае маленькія «зялёныя крокі». Прынеслі ў клас каробку з-пад халадзільніка.

— Дзецям вельмі спадабалася яе папаўняць, рабілі свае ўклады ў наш папяровы банк і іншыя вучні, педагогі, — успамінае Таццяна Мікалаеўна.

Збор макулатуры распаліў цікавасць вучняў да раздзельнага збору смецця. Дзеці сталі прывучаць сваіх хатніх сартаваць адходы. Падлеткі выказалі жаданне высветліць, чаму нельга разам са смеццем выкідваць батарэйкі. Зрабілі асобныя запаснікі для адпрацаваных батарэй і акумулятараў, накрывак да пластыкавых бутэлек. Сёння, кажа настаўніца, дзеці самастойна сартуюць пластыкавыя бутэлькі, прыносяць іх у школу, адкуль пластык потым забіраюць на перапрацоўку.

## Тураўская Мары Конда

Цікавы кірунак работы з вучнямі па далучэнні да асэнсаванага спажывання ў рэчышчы імкнення да мінімізацыі экалагічнага следу нарадзіўся з назірання ў за паводзінамі саміх жа падлеткаў у класе.

— У нас у Тураве няма вялікіх крам ці рынкаў, дзе можна набыць адзенне. І, здаралася, у суботу, калі чакаеш дзяцей у школе на заняткі па інтарэсах, дзяўчаты адпрошваюцца. Аказалася — з бацькамі ў Альшаны за абноўкамі. Казалі, вось купяць без нас, а потым не падабаецца, ляжыць адзенне. Многія прызналіся, што спакушаюць іх на пакупкі ролікі бьюці- і фэшн-блогераў. Мне стала цікава, як данесці падлетку, якому важна быць у трэндзе, што «хуткая мода» павольна, але дакладна забівае нашу экалогію, — расказала Таццяна Зямлянік.

Яна распрацавала трэнінг для падлеткаў. Паставіла для сябе задачу данесці ў цікавай і даступнай для старэйшых школьнікаў форме інфармацыю, што індустрыя моды падбівае людзей хутка і танна абнаўляць свой гардэроб, купляць больш, а насіць і захоўваць менш. Рэчы пыляцца ў шафах ці гніюць на звалках, пры гэтым на вытворчасць адзення трацяцца каласальныя рэсурсы.

— Стаць удзельнікамі трэнінгу выказала жаданне амаль трыццаць падлеткаў — хлопцы і дзяўчаты, вучні 8—10 класаў, — тлумачыць настаўніца. — Пры гэтым былі і тыя, хто катэгарычна адмовіўся браць удзел у такім чэленджы. Увогуле ідэя майго трэнінгу — пасля вывучэння інфармацыі аб асэнсаваным спажыванні, адмове ад кансумерызму, правесці рэвізію дома ва ўласных шафах, расхламіць іх, падзяліцца адзеннем, калі ёсць жаданне, увогуле перагледзець стаўленне да куплі адзення.

Па выніках трэнінгу педагог адзначыла перамены ў стаўленні падлеткаў да адзення. Калі спачатку школьнікам было цяжка адмовіцца ад набыцця менавіта новага адзення, яны былі катэгарычна супраць адзення з сэканд-хэндаў, рэчаў «у спадчыну», то некаторыя пасля змянілі сваё стаўленне. Многія прызналіся, што калі перабралі свае шафы, здзівіліся колькасці адзення, якое куплялася, але амаль не насілася.

## Пакет са старых джынсаў

Настаўніца з вучнямі зрабіла яшчэ адзін «зялёны крок». Заручылася падтрымкай настаўніцы працоўнага навучання і на ўроках па шыцці са старых рэчаў дзеці выкраілі і пашылі шоперы — экалагічныя торбы.

— Вось вам і каапераця — уменне працаваць у камандзе, і камунікацыя — хадзіць па вуліцах горада і прэзентаваць гаспадыням уласны экапрадукт. Усё гэта развівае тыя жыццёвыя навыкі, якія неабходныя нашым дзецям цяпер, — лічыць Таццяна Мікалаеўна. — Хай нашаму пакаленню і не трэба тлумачыць, як зручна закупляцца з саморобнай торбай, ці шоперам — на мове моладзі. Але многім вельмі прыемна, што іх дзеці-ўнукі пашылі самі такія прыдатныя для гаспадаркі рэчы, пры гэтым не «тузалі за рукаў» бацькоў — дай грошы на тканіну для «працоўнага навучання», а, выходзіць, перапрацавалі тое, што было непатрэбна.

Для дзяцей таксама аказалася вельмі важным даведацца пра тое, што ў нашай краіне таксама ёсць сапраўдная гуру мінімальнага экалагічнага следу.

Ідэю расказваць дзецям пра экахвалю ў адзенні падтрымалі педагогі з розных куткоў краіны, калі настаўніца з Турава прэзентавала свой трэнінг у прафесійным асяроддзі.

— Некалькі месяцаў таму ў сваёй школе я распачала новы праект — заняткі для вучняў старэйшых класаў па медыяадукацыі, — працягвае настаўніца. — Мы вучымся шукаць неабходную інфармацыю ў інтэрнэце, фільтраваць яе, а таксама выкладваць туды ўласныя даследаванні, вынікі пэўнай работы, цікавыя факты. Спачатку на такія заняткі па суботах хадзіла менш за дзесяць вучняў. Цяпер уся старэйшая паралель і шостыя класы прасіцца. Дзеці аналізуюць ролікі сваіх любімых блогераў, разбіраюць іх паводзіны, адзенне, лексіку ў стрымах. Важна, што дзеці такім чынам дзеляцца сваёй культурай, імкнуцца пачуць і маё меркаванне па гэтых пытаннях. А яшчэ нашы заняткі — меседж для маладых педагогаў: не бойцеся ехаць у глыбінку. Тут можа быць вельмі цікава, ёсць магчымасць рабіць разам унікальныя даследаванні, распрацоўваць уласныя метадыкі нефармальнай работы з дзецьмі. Эмацыянальная аддача — каласальная.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота з архіва гераіні.**

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***


ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ (ПОВТОРНЫХ) ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | **ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: www.torgi24.by** |
| **Продавец** | **СООО «Бивер Трейд», 211260, Витебская область, г. п. Шумилино, ул. Северная, 9** |

**Предмет торгов:**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена |
|---|---|---|
| *793* | Прицеп лесовоза, IN.PROIZV EP24M3PB, гос. № А5545А | 4873,62 |
| *794* | Прицеп лесовоза СМТ РТ12-20, гос. № А5541А-2 | 7249,36 |
| *795* | Оцилиндровочный «Мастер ОЦ-550» | 7795,72 |

**расположенный по адресу:**
Витебская обл., Шумилинский р-н, г. п. Шумилино

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета торгов в белорусских рублях (**для каждого лота**) перечисляется на р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после торгов

**Условия оплаты предмета торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 10 (десяти) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки ООО «Расантехторг», размещенным по адресу: www.torgi24.by

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **5 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение торгов составили: по лоту (для каждого лота) – не более **1 350,00 бел. руб.**

**Дата и время начала торгов – 08.02.2022 г. с 09.00 до 16.00.**
Торги продлеваются на 3 минуты с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 3 минуты до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок – 04.02.2022 г. до 17.00** на ЭТП ООО **«Расантехторг»** по электронному адресу: **www.torgi24.by**

**Контактные данные:**
**+375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87.**
**E-mail: info@torgi24.by.**



**ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Строитель-197», г. Молодечно**

| Лот | Наименование Лота | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, BYN | Задаток, BYN | Шаг аукциона, BYN |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Кап. строение (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – двухэтажное кирпичное здание базы) с инв. № 630/С-38998, общей площадью 870,5 кв. м | 238 080,00 | 23 808,00 | 11 904,00 |
| 2 | Кап. строение (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – одноэтажное кирпичное здание конторы) с инв. № 630/С-39007, общей площадью 335,3 кв. м, с составными частями и принадлежностями (три навеса); система пожарной сигнализации | 179 808,00 | 17 980,80 | 8 990,40 |
| 3 | Автобус ГАЗ-3307 | 2 940,00 | 294,00 | 147,00 |
| 4 | Автогидроподъемник ВС-22-11, инв. № 998 | 8 820,00 | 882,00 | 441,00 |
| 5 | Автокран КС-35714К, инв. № 67 | 19 020,00 | 1 902,00 | 951,00 |
| 6 | Автомашина LADA 21144.110-32, инв. № 84 | 1 380,00 | 138,00 | 69,00 |
| 7 | Автомобиль грузовой бортовой MERCEDES-BENZ, инв. № 55 | 2 940,00 | 294,00 | 147,00 |
| 8 | Компрессор ЗИФ 55В, б/у, инв. № 11 | 1 980,00 | 198,00 | 99,00 |
| 9 | Полуприцеп МАЗ-938660-(044), инв. № 957 | 1 920,00 | 192,00 | 96,00 |
| 10 | Теплогенератор мобильный ЕС 55 Италия, инв. № 967 | 588,00 | 58,80 | 29,40 |
| 11 | Трансформаторная подстанция, инв. № 1438 | 780,00 | 78,00 | 39,00 |
| 12 | Штукатурная станция, инв. № 1437 | 1 260,00 | 126,00 | 63,00 |
| 13 | Штукатурная станция ШС-4/6, инв. № 250 | 1 860,00 | 186,00 | 93,00 |
| 14 | 1. Бур почвенный Д 250 мм; 2. Мотобур ВТ 360 | 1 557,36 | 155,74 | 77,87 |

Лоты 1, 2 расположены на земельном участке с кадастровым номером **642000000003000670** общей площадью **0,8586 га** для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственной базы по ул. Металлистов,1 в г. Молодечно

В отношении Лотов 1, 2 проводятся вторые повторные торги. **Стоимость снижена на 20 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 251 (29620) от 29.12.2021, стр. 15, № 217 (29586) от 10.11.2021, стр. 6. В отношении Лота 3 проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 50 %.** В отношении Лотов 4-13 проводятся четвертые повторные торги. **Стоимость снижена на 50 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 251 (29620) от 29.12.2021, стр. 15, № 228 (29597) от 25.11.2021, стр. 15, № 205 (29574) от 23.10.2021, стр. 13, № 175 (29544) от 11.09.2021, стр. 6, № 141 (29510) от 27.07.2021, стр. 6. В отношении Лота 14 проводятся четвертые повторные торги. **Стоимость снижена на 40 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 251 (29620) от 29.12.2021, стр. 15, № 228 (29597) от 25.11.2021, стр. 15, № 212 (29581) от 03.11.2021, стр. 15, № 190 (29559) от 02.10.2021, стр. 15, по лоту 19.2 (Мотобур ВТ 360) – 175 (29544) от 11.09.2021, стр. 6

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **2 февраля 2022 года в 12.30 (регистрация – с 12.00 до 12.25) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, дом 1, офис 1127** |
| **Срок приема заявлений и оплаты задатка** | **с 10.00 21.01.2022 по 16.00 31.01.2022 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127** |
| **Местонахождение имущества** | **Минская область, г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 1** |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту __, ОАО «Строитель-197», г. Молодечно, проводимых 02.02.2022.

2. Заявления на участие и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах, копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта; копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Контактное лицо по вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе – Анаида (+375 29 308 28 97).

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете «Звязда») на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: по лотам 1, 2 составляет 5 % от конечной цены предмета торгов; по лотам 3–19 – 7,5 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня подписания (заключения) договора купли-продажи. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. **По вопросу осмотра объектов обращаться к Александру Владимировичу (+375293697036).** По вопросу наличия обременений обращаться к Артуру (+375(29)339-68-45).

8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

9. Государственная регистрация договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет. Государственная регистрация договора купли-продажи транспортных средств и снятие их с государственного учета осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram: https://t.me/orgtorg** |
| **Продавец** | **ОАО «Строитель-197», г. Молодечно (Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 1) в лице ликвидатора ООО «Партнёр-Консультант», тел.: +375(29)339-68-45 (Артур)** |

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

21 студзеня 2022 г. № 2 (638)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


АКЦЭНТЫ









Фота БелТА.

### Наталля КАЧАНАВА — маладым парламентарыям:

# «ВЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ ПРЫКЛАДАМ ДЛЯ АДНАГОДКАЎ»

### Старшыня Савета Рэспублікі ўзяла ўдзел у пасяджэнні Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе

**У верхняй палаце парламента адбылося падвядзенне вынікаў работы маладзёжнага крыла за мінулы год. Перад удзельнікамі выступіла спікер Савета Рэспублікі і расказала аб сваім бачанні тых задач і прыярытэтаў у рабоце, якія павінны стаяць перад членамі Маладзёжнага савета (парламента), створанага пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь.**

## На карысць краіны і народа

— Галоўная задача — працаваць на карысць нашай краіны і нашага народа, — акцэнтавала ўвагу ў гутарцы з журналістамі Наталля Качанава.

Яна нагадала, што сёння маладыя парламентарыі цесна працуюць разам з сенатарамі на розных мерапрыемствах: на пасяджэннях сесій Савета Рэспублікі, прыёмах па асабістых пытаннях, выязных прэзідыумах у рэгіёнах, круглых сталах, якія хвалююць грамадства.

— Гэта нашы агульныя задачы, — адзначыла яна і падкрэсліла: — Але самым галоўным мне бачыцца ў рабоце нашых маладых калег — яны павінны больш актыўна працаваць са сваімі аднагодкамі ў рэгіёнах.

Спікер нагадала, што сёння прадстаўніцтва рэгіёнаў у Маладзёжным парламенце маштабнае (па 10 чалавек ад вобласці), таму яго члены павінны быць прыкладам, пунктам прыцягнення для такіх жа маладых людзей, каб разам вырашаць важныя пытанні ў жыцці краіны.

Паводле яе меркавання, гэта датычыцца такіх кірункаў работы, як валанцёрскі рух, работа з маладымі людзьмі, што трапляюць у цяжкае жыццёвае становішча, узаемадзеянне з маладымі сем'ямі — прывіванне ім традыцыйных каштоўнасцяў.

— Працуючы над Асноўным Законам нашай краіны, мы ўбачылі, што людзей вельмі хвалюе статус сям'і, зносіны ў ёй, — растлумачыла Наталля Качанава. — Людзей вельмі хвалюе, што заходнія краіны навязваюць абсалютна нетрадыцыйныя для нас каштоўнасці (аднаполыя шлюбы і ўсё астатняе). І гэта выклікае ў іх моцную занепакоенасць.

Яна звярнула ўвагу, што ў своеасаблівым рэйтынгу зваротаў у Канстытуцыйную камісію гэтая тэма выйшла на першае месца.

— Таму роля маладых парламентарыяў — працаваць з большай энергіяй, бо гэта важна, калі роўны вучыць роўнага, — лічыць Старшыня Савета Рэспублікі. — Там, дзе не дастукаецца дарослы да маладога чалавека, да падлетка ў пераходным узросце — да яго можа дастукацца малады чалавек, які яму падкажа, як правільна, і дапаможа выбраць патрэбны кірунак у жыцці.

Наталля Качанава адзначыла, што работа павінна весціся маладымі парламентарыямі па ўсіх праблемных пытаннях, што існуюць у грамадстве: па супрацьдзеянні п'янству і алкагалізму, распаўсюджванню брыдкаслоўя, наркаманіі.

Акрамя таго, спікер верхняй палаты парламента лічыць неацэннай работу маладых парламентарыяў па давядзенні праўды.

— Гэтыя маладыя людзі з'яўляюцца ўдзельнікамі практычна ўсіх важных мерапрыемстваў у нашай краіне: яны ўдзельнічаюць ва Усебеларускім народным сходзе, нарадах, Рэспубліканскім педагагічным савеце, пасяджэннях сесіі Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі, — прывяла прыклады Наталля Качанава і адзначыла: — Яны глыбока паглыбленыя ў тое, што рэальна адбываецца ў нашай краіне. І гэтую праўду яны павінны данесці да сваіх аднагодкаў.

Спікер верхняй палаты парламента звярнула ўвагу і на яшчэ адзін важны аспект у рабоце маладзёжных арганізацый.

— Важна, каб яны ўзаемадзейнічалі адна з адной: БРСМ, Маладзёжны савет, рух (Наперад. — **Заўв. аўт.**) — яны павінны працаваць разам, не канкурыраваць паміж сабой, а ўзаемадзейнічаць. А мы бачым, што ў іх складваецца нядрэннае ўзаемадзеянне, бо яны ўсе прысутнічаюць на падвядзенні вынікаў, і гэта вельмі добра, — заўважыла Наталля Качанава.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# У адкрытым фармаце

### Беларусь гатовая да шырокага дыялогу з Саудаўскай Аравіяй

**Аб гэтым заявіла спікер верхняй палаты беларускага парламента Наталля Качанава на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Каралеўства Саудаўская Аравія ў Расійскай Федэрацыі і Рэспубліцы Беларусь па сумяшчальніцтве Абдулрахманам Сулейманам аль-Ахмадам, якая адбылася ў Савеце Рэспублікі. Удзельнікі абмеркавалі стан і перспектывы двухбаковага міждзяржаўнага і міжпарламенцкага супрацоўніцтва.**

У сустрэчы таксама ўзялі ўдзел члены Савета Рэспублікі — старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў і кіраўнік рабочай групы па супрацоўніцтве з парламентам Каралеўства Саудаўская Аравія Алег Румо.

— Беларусь аддае самую сур'ёзную ўвагу дружалюбным адносінам паміж нашымі краінамі, — акцэнтавала яна ўвагу ў пачатку сустрэчы і падкрэсліла: беларускі бок гатовы супрацоўнічаць абсалютна па ўсіх кірунках, якія выклікаюць зацікаўленасць у Саудаўскай Аравіі і будуць спрыяць умацаванню партнёрскіх сувязяў.

Наталля Качанава выказала ўпэўненасць, што візіт дыпламата ў Беларусь надасць новы імпульс ва ўзаемаадносінах краін і будзе садзейнічаць развіццю дружбы паміж двума народамі.

Спікер адзначыла важнасць супрацоўніцтва па ўсіх кірунках, звярнуўшы ўвагу на міжпарламенцкае ўзаемадзеянне.

— Для нас, членаў Савета Рэспублікі, важнае супрацоўніцтва паміж парламентарыямі нашых краін, — падкрэсліла яна, нагадаўшы аб магчымасцях адпаведных груп дружбы, якія створаны ў Саудаўскай Аравіі і ў Беларусі. — Пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь створана такая група, якую ўзначальвае член Савета Рэспублікі, дырэктар РНПЦ транспланталогіі і гематалогіі Алег Румо.

Наталля Качанава зрабіла акцэнт на магутным патэнцыяле гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж дзяржавамі, у развіцці якога парламентарыі адыгрываюць не апошнюю ролю. Карыстаючыся выпадкам, яна запрасіла спікера парламента Каралеўства Саудаўская Аравія і кіраўніка адпаведнай групы дружбы наведаць з афіцыйным візітам Беларусь, каб вызначыць планы па далейшым супрацоўніцтве паміж парламентарыямі абедзвюх краін.

— Мы гатовыя да дружбы і супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі і народамі, таму адкрытыя для шырокага дыялогу з Саудаўскай Аравіяй, — яшчэ раз падкрэсліла яна.

Разам з тым, звяртаючы ўвагу на тое, што ўжо адбылася сустрэча з кіраўніцтвам МЗС Беларусі і Палаты прадстаўнікоў і некаторае кола пытанняў ужо гучала, Наталля Качанава вылучыла адзін важны тэзіс:

— Наша краіна адкрытая для грамадзян Саудаўскай Аравіі (у нас уведзены бязвізавы рэжым), таму мы разлічваем, што ў адносінах да беларусаў будзе прынята такое ж рашэнне, — адзначыла яна.

Са свайго боку, Абдулрахман Сулейман аль-Ахмад падзякаваў Наталлі Качанавай за магчымасць правесці асабістую сустрэчу і пацвердзіў прыхільнасць да захавання добрых дружалюбных адносін паміж краінамі, далейшага развіцця міжпарламенцкага ўзаемадзеяння.

Дыпламат адзначыў, што з-за COVID-19 былі часова прыпынены абмен візітамі, і выказаў надзею, што ў хуткім часе сітуацыя нармалізуецца. Пасол таксама дадаў, што Саудаўская Аравія ўдзельнічае ў тэндары па падрыхтоўцы выставы «Экспа-2030», і папрасіў падтрымкі ў Беларусі па дадзеным пытанні.

Спікер верхняй палаты парламента запэўніла госця, што ўсе ўзнятыя ім на сустрэчы пытанні будуць уважліва разгледжаны.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# «ВЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ ПРЫКЛАДАМ ДЛЯ АДНАГОДКАЎ»



Фота БелТА.

## «Сенат» — новы сезон

Аб дзейнасці Маладзёжнага парламента за 2021 год расказаў яго **старшыня Ягор МАКАРЭВІЧ**. Малады парламентарый падрабязна спыніўся на пытаннях рэгіянальнага ўзаемадзеяння і ўцягвання маладых людзей у дзейнасць Маладзёжнага парламента, актывізацыі інфармацыйнай дзейнасці ў сетцы Інтэрнэт і СМІ, захавання аб'ектыўнай гістарычнай памяці. Таксама надаў увагу такім актуальным кірункам, як работа над унясеннем змяненняў у Канстытуцыю, а таксама ў заканатворчай дзейнасці.

У прыватнасці, малады парламентарыі ініцыіравалі праект «Гістарычная памяць», у рамках якога ў Бярозе Брэсцкай вобласці на месцы размяшчэння канцэнтрацыйнага лагера прайшоў мітынг-рэквіем, а таксама абвешчаны збор сродкаў на стварэнне мемарыяльнага комплексу ахвярам палітычных рэпрэсій польскіх улад на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў перыяд 1921—1939 гадоў. Гэты помнік быў абноўлены напярэдадні першага Дня народнага адзінства — 17 верасня 2021 года.

Удзельнічалі юныя парламентарыі і ў пасадцы «Алеі Перамогі».

— З прадстаўнікамі грамадскасці і палітычных сіл падчас старту праекта ў Мінску адбылася закладка аднайменнай алеі. Далучыцца да акцыі мог любы беларус, высадзіўшы дрэва ў памяць аб загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны, — паведаміў Ягор Макарэвіч.

Таксама была заменена ўстарэлая мемарыяльная дошка ў сталіцы ў памяць аб выдатным савецкім і беларускім палітычным дзеячы, арганізатары камсамольскага падполля Заходняй Беларусі, удзельніку Вялікай Айчыннай вайны Сяргеі Прытыцкім.

Паводле слоў лідара маладых парламентарыяў, дзейнасць у інфармацыйнай прасторы накіравана як на новыя, так і традыцыйныя медыя.

Так, у Маладзёжнага парламента з'явіўся свой сайт — mpns.by, праводзіцца актыўнае абнаўленне інфармацыі аб яго дзейнасці ў сацыяльных сетках. Ягор Макарэвіч кажа, што за год зарэгістравана каля 2000 водгукаў і запытаў аб маладзёжным парламенце.

— Сумесна з патрыятычнай блогерскай супольнасцю запушчаны праект па асвятленні дзейнасці членаў Маладзёжнага парламента. Выпускі праекта транслiраваліся ў ранішнім блоку на тэлеканале «РТР-Беларусь», а таксама размяшчаліся ў сацыяльных сетках, — паведаміў старшыня Маладзёжнага парламента.

Летам на тэлеканале «СТБ» з'явілася аўтарская інфармацыйна-аналітычная рубрыка «Сенат», у якой асвятляецца дзейнасць членаў Савета Рэспублікі і маладых парламентарыяў. Цяпер прапрацоўваецца абноўленне канцэпту і рыхтуецца новы сезон праграмы.

## Роўны вучыць роўнага

Гаворачы аб змяненнях і дапаўненнях у адносінах да Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Ягор Макарэвіч — член Канстытуцыйнай камісіі — падкрэсліў, што моладзі аказаны вялікі давер — удзельнічаць у вырашэнні лёсу сваёй краіны.

Праводзіліся дыскусійныя пляцоўкі «Беларусь будучыні» для акумулявання прапаноў маладых грамадзян па Асноўным Законе. На сайце Маладзёжнага парламента таксама арганізаваны збор прапаноў.

Лідар маладых парламентарыяў перакананы ў важнасці сустрэч з аднагодкамі для абмеркавання важных тэм грамадска-палітычнага жыцця краіны, паколькі маладыя людзі больш успрымальныя да інфармацыі ад роўнага.

Спікер верхняй палаты парламента акцэнтавала ўвагу на ўдзеле моладзі ў падрыхтоўцы праекта Асноўнага Закона

— Важная падзея — работа над Асноўным Законам краіны. Моладзь працавала ў Канстытуцыйнай камісіі. Нам важнае ваша меркаванне. Галоўнае, каб вы праводзілі гэтую работу шчыра, без фармалізму, — адзначыла Наталля Качанава.

Дарэчы, па ініцыятыве Савета Рэспублікі ўнесена шмат прапаноў, якія сёння падтрыманыя. Сенатары прапанавалі і асобны артыкул аб моладзі, які гарантаваў бы яе падтрымку дзяржавай.

Спікер Савета Рэспублікі агучыла задачу маладым парламентарыям напярэдадні рэферэндуму:

— Абмеркаванне Канстытуцыі падышло да завяршэння. Мы ідзём да рэферэндуму. І таму ваша задача — працягваць актыўна тлумачыць вашым аднагодкам пытанні, якія іх хвалююць. Далучайцеся, — заклікала яна. — Толькі не трэба думаць, што гэта вы не вырашыце. Вырашыце. Вы можаце звярнуцца да сенатара, які працуе ў вашым рэгіёне. Члены Савета Рэспублікі шмат робяць, каб верхняя палата парламента працавала эфектыўна на карысць народа і краіны.

## Быць актыўнымі і ініцыятыўнымі

Што датычыцца міжнароднага парадку дня, нягледзячы на эпідэмічную сітуацыю, перыяд таксама быў насычаным. Ягор Макарэвіч расказаў, што прайшлі сустрэчы з калегамі з Цюмені, Санкт-Пецярбурга, Прыморскага краю, Кітая. Члены Маладзёжнага парламента актыўна ўдзельнічалі ў восьмым Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

Таксама члены Маладзёжнага парламента прымалі заявы па фактах ціску з боку міжнароднай супольнасці на нашу краіну.

— Мы працягнем гэтую тэндэнцыю. Важна, каб нашы аднагодкі, якія жывуць за мяжой, бачылі, што моладзь Беларусі мае разумны пункт гледжання на тыя падзеі, якія адбываюцца, і маглі атрымаць аргументаваны адказ на хвалю ціску ў дачыненні да нашай краіны, — заявіў Ягор Макарэвіч.

Працягваючы тэму, Наталля Качанава звярнула ўвагу маладых людзей на ўменне аналізаваць і вылучаць праўдзівую інфармацыю з вялікай колькасці хлусні і фэйкаў, якія апанавалі нашу краіну.

— А праўда — на паверхні. Усе намеры разбурыць нашу краіну — гэта адназначна спланаваная акцыя. Пасля таго як не атрымаўся бліцкрыг, прыдумалі гвалт, потым самалёт, потым сітуацыю з бежанцамі. У чым толькі не абвінавачваюць нашу краіну, а ўсё развальваецца, як картачны домік, — кажа спікер.

Падводзячы вынікі сустрэчы, Наталля Качанава выказала пажаданні Маладзёжнаму парламенту быць больш настойлівымі і актыўнымі ў адстойванні сваёй пазіцыі.

— Будзьце неабыякавыя, выразна пераканаsuccinct ў сваіх пазіцыях. Калі ты працуеш сумленна і адкрыта з людзьмі — людзі гэта ацэняць, — пераканаучая яна. — Трэба вызначыць галоўнае для сябе, — сказала парламентарый і падкрэсліла, што ад кожнага чалавека шмат у чым залежыць будучыня краіны.

Яна выказала падзяку маладым людзям, якія ў няпросты час выразна ўсведамлялі, што яны — за сваю краіну і за свой народ.

— Разумелі, што для вас робіць улада, наколькі дзяржава падтрымлівае моладзь, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Таму што няма такой іншай краіны ў свеце, дзе столькі клапаціліся б пра людзей у розных няпростых сітуацыях, дзе людзям настолькі даступныя органы ўлады.

У завяршэнне яна пажадала моладзі поспехаў у рабоце, грамадскай дзейнасці і вучобе.

— Вы павінны думаць аб нашай краіне, аб тым, як важна яе захаваць такой, якая яна ёсць сёння. Дапамога ваша ў гэтым проста неацэнная, — рэзюмавала спікер верхняй палаты парламента.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

***(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)***

РАБОТА Ў РЭГІЁНАХ

# СЯМЕЙНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ — У ПРЫЯРЫТЭЦЕ

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ наведаў з рабочым візітам Лідчыну. Тут сенатар правёў сустрэчу з мясцовымі жыхарамі па планаваных змяненнях у Канстытуцыю і ўдзеле ў рэферэндуме, азнаёміўся з работай прадпрыемства «Бел-Пласт Інтэрнэшнл», завітаў у Лідскую цэнтральную раённую бальніцу і ветэрынарную клініку «Кот Бегемот».**

Напярэдадні важнай палітычнай падзеі гэтага года — рэферэндуму па Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь — адбылася зацікаўленая гутарка на сустрэчы ў раённым Палацы культуры. Старшыня профільнай камісіі растлумачыў сутнасць і значэнне паправак, якія ўносяцца ў Асноўны Закон, падрабязнасці змяненняў і чаму неабходнасць у гэтым наспела менавіта цяпер.

У якасці экспертаў на дыялогавай пляцоўцы таксама выступілі прадстаўнікі выканаўчай улады, дэпутацкага корпуса, грамадскіх аб'яднанняў раёна.

Размова атрымалася прадметнай, увага была акцэнтавана на ўзмацненні ролі народаўладдзя, замацаванні сямейных і маральна-этычных каштоўнасцяў у грамадстве, забеспячэнні захавання гістарычнай праўды і памяці аб героічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Віктар Лісковіч зрабіў акцэнт на тым, што абноўленая Канстытуцыя — дакумент глыбока прадуманы. У ім замацаваны і пашыраны пазіцыі, якія дазволяць развівацца грамадству і эканоміцы.

— У прыярытэце застаюцца традыцыйныя сямейныя каштоўнасці, падтрымка мацярынства, бацькоўства і дзяцінства, асаблівы клопат пра людзей сталага ўзросту і інвалідаў, — паясніў сенатар. — Усе нова ўвядзенні, унесеныя ў праект Асноўнага Закона, дазволяць захаваць і прымножыць дасягненні незалежнай беларускай дзяржавы, а грамадзянам адчуваць сябе яшчэ больш упэўненымі і абароненымі.

У рамках рабочага візіту сенатар наведаў СТАА «Бел-Пласт Інтэрнэшнл». Парламентарый пагутарыў з калектывам, а таксама азнаёміўся з умовамі працы, поспехамі, дасягненнямі і перспектывамі развіцця сумеснага таварыства, асаблівую ўвагу ўдзяліў тэхналогіі вытворчасці і бяспечнасці прадукцыі.

— Прадпрыемства сёння з'яўляецца лідарам у вытворчасці пластмасавай упакоўкі на тэрыторыі нашай краіны. Аднак выпускаючы высакаякасную прадукцыю, важна не забываць аб стварэнні бяспечных і спрыяльных для здароўя ўмоў працы, захаванні патрабаванняў аховы працы і экалагічнага заканадаўства, — падкрэсліў Віктар Лісковіч.

У рамках рабочага візіту старшыня профільнай камісіі наведаў хірургічны корпус Лідскай ЦРБ пасля маштабнай мадэрнізацыі, якая завяршылася ў снежні мінулага года.

У адрамантаваным корпусе размясціліся прыёмнае аддзяленне, аддзяленні анестэзіялогіі і рэанімацыі, аперацыйны блок, хірургічныя аддзяленні і іншыя.

— Сістэма аховы здароўя — адзін з ключавых кірункаў развіцця нашай краіны. Асаблівая ўвага аддаецца паляпшэнню даступнасці, якасці медыцынскай дапамогі, стварэнню камфортных умоў знаходжання пацыентаў. Цяпер і персаналу тут працаваць вельмі прыемна. Бо для ўрача выратаванне людзей — штодзённая праца. Нягледзячы ні на якія катаклізмы, медработнікі самааддана робяць тое, пра што гаворыцца ў клятве Гіпакрата: лечаць і ратуюць. У перыяд пандэміі гэта было наглядна прадэманстравана. Тут была аказана ўся неабходная дапамога жыхарам і Лідскага раёна, і суседніх рэгіёнаў, — адзначыў сенатар.

У ветэрынарным цэнтры старшыня профільнай камісіі азнаёміўся з яго дзейнасцю і пагутарыў з працоўным калектывам.

Трэба сказаць, што клініка аказвае шырокі спектр медыцынскіх паслуг — пачынаючы ад кансультацый і прышчэпак і заканчваючы складанымі хірургічнымі ўмяшаннямі. Гэта першы і пакуль адзіны цэнтр не толькі ў Гродзенскай вобласці, але і Беларусі, які займаецца пратэзаваннем канечнасцяў для хатніх гадаванцаў. У распараджэнні супрацоўнікаў — абсталяваная рэанімацыйная палата, лабараторыя, апарат УГД экспертнага класа, аддзялення рэабілітацыі і інтэнсіўнай тэрапіі.

— У любой сферы важна, каб спецыяліст быў не толькі дасведчаным і меў поўныя веды для ажыццяўлення сваёй дзейнасці, але і любіў справу, якой займаецца. Ветэрынар — адна з самых высакародных і гуманных прафесій. Выпадковых людзей у ёй не бывае. Для неабыякавых спецыялістаў клінікі пратэзаванне — не камерцыйны праект, а магчымасць вывучыць нешта новае і памяняць стаўленне да трапіраваных гадаванцаў. Бо стаўленне да жывёлін з'яўляецца важнай часткай жыццядзейнасці чалавека. Характар гэтых адносін адлюстроўваецца на маральным, сацыяльным, экалагічным і эканамічным баках жыцця грамадства, — адзначыў Віктар Лісковіч.

Расказ будзе няпоўны, калі не згадаць аб адной нечаканай сустрэчы, якая здарылася пры наведванні Лідскай ЦРБ. Як расказаў сенатар у адной з сацсетак, там яго сустрэла медыцынская сястра аддзялення дзіцячай хірургіі Лілія Мацкевіч. Як высветлілася, 15 жніўня 1985 года ў яе маці Віктар Лісковіч прымаў роды. Тады ён працаваў у Астраўцы. У выніку на свет з'явілася дзяўчынка Лілія вагой 4 кг 750 грамаў, якая вырасла і ў далейшым абрала прафесію медыцынскага работніка.

— Вось такая прыемная сустрэча праз 36 гадоў, — кажа ён і адзначае, што за сваю медыцынскую практыку асабіста прыняў больш за 6500 родаў.

На адной хвалі

# «БЕЛАРУСЬ» — СТАРТАВАЯ ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ МАЛАДЫХ ЖУРНАЛІСТАЎ З КІТАЯ

**Міжнароднае радыё «Беларусь» і Інстытут журналістыкі і камунікацыі Ляянскага педагагічнага ўніверсітэта (правінцыя Хэнань, КНР) запусцілі сумесную праграму прафільнай падрыхтоўкі спецыялістаў-міжнароднікаў.**

Новы праект мае на ўвазе анлайн-практыку студэнтаў гэтай навучальнай установы ў якасці суаўтараў і вядучых выпускаў навін на кітайскай мове, арганізацыю перадач, круглых сталоў і радыёмастоў, прысвечаных беларуска-кітайскаму супрацоўніцтву. Такі падыход дазволіць зрабіць больш разнастайнымі формы падачы інфармацыі і пашырыць галасавую палітру праграм па-кітайску за кошт таго, што ў ролі вядучых будуць задзейнічаны носьбіты мовы.

Трэба адзначыць, што беларускае радыё таксама актыўна супрацоўнічае і з афіцыйным інфармацыйным агенцтвам урада КНР «Сіньхуа», і з Міжнароднай службай навін Кітая China News Service.

— Развіццё кантактаў з замежнымі партнёрамі — адзін з важных кампанентаў нашай вяшчальнай палітыкі, — адзначае **галоўны дырэктар Міжнароднага радыё «Беларусь» Валерый РАДУЦКІ.** — Улічваючы стратэгічны характар супрацоўніцтва нашай краіны з Кітаем і тое, што ў 2022 годзе адзначаецца 30-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін, такое ўзаемадзеянне важнае і перспектыўнае.

Як падкрэсліў Валерый Радуцкі, галоўная задача міжнароднага вяшчання — прасоўванне інтарэсаў Беларусі ў сусветнай медыяпрасторы. І асабліва актуальна яно ў рабоце з аўдыторыяй, якая складае пераважную частку слухачоў і гаворыць па-кітайску.

У сваю чаргу, дырэктар Інстытута журналістыкі і камунікацыі Ляянскага педагагічнага ўніверсітэта Лі Чжэнсю адзначыў высокі ўзровень беларускай журналістыкі ў цэлым і ў прыватнасці прафесіяналізм супрацоўнікаў Міжнароднага радыё «Беларусь», падкрэсліўшы запатрабаванасць праграм Беларускага радыё ў кітайскай аўдыторыі: «Слухачы ў Кітаі павінны больш ведаць пра вашу краіну, яе культуру, гісторыю і сучаснасць».

# ШАШКІ

**(«Звязда»)** Выпуск № 157

23—29 снежня ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі адбыліся турніры першай лігі чэмпіянату Беларусі па шашках-64 сярод мужчын і жанчын. У жаночым турніры перамагла Вікторыя Нікалаева, яшчэ тры пуцёўкі ў вышэйшую лігу заваявалі Яўгенія Швед, Марыя Часнакова і Дар'я Нікіфарава. У мужчынскім турніры ўпэўнена заняла першае месца міжнародны гросмайстар Вера Хвашчынская, пуцёўкі ў вышэйшую лігу таксама атрымалі Ілья Астаф'еў, Сяргей Садоўскі, Мікалай Бярэзін, Яўген Капусцін.

**№ 7**



**№ 7** В. Марцінкевіч — moshe

**Белыя простыя шашкі:** e1, b2, a3, e3, h4, a5 (6).

**Чорныя простыя шашкі:** c5, b6, d6, a7, c7, g7 (6).

Гэтую пазіцыю са сваёй партыі, якую гуляў у інтэрнэце, даслаў наш чытач з г. Глыбокага Васіль Марцінкевіч. Становішчу чорных не пазайздросціш. Злева безустойная, звязаная групоўка з пяці шашак, справа толькі адзін абаронца фланга. Белыя падыходзяць да рашаючых дзеянняў 20. e3-f4 c5-d4 21. a3-b4 b6-c5, а цяпер камбінацыя, пакажыце яе.

Яшчэ некалькі цікавых камбінацый са сваёй практычнай гульні даслаў Сяргей Бурко.

**№ 8** Бурко С. — Пракоп'еў В.

**Белыя простыя:** a1, c1, e1, g1, c3, d4, f4, a7 (8).

**Чорныя простыя:** a3, d6, f6, h6, c7, e7, b8, h8 (8).

Чорныя неасцярожна згулялі 10...f6-g5 услед рушыла нескладаная камбінацыя, пакажыце яе.

**№ 9** Бурко С. – Куніца А.

**Белыя простыя:** c1, e1, g1, c3, d4, f4, a7 (7).

**Чорныя простыя:** a3, d6, f6, h6, c7, b8, f8 (7).

Становішча крыху адрозніваецца ад папярэдняга, але пасля 12...f6-g5?? да перамогі вядзе такая ж самая камбінацыя. Адшукайце самастойна.

У шашкі-100 дамачную кампазіцыю даслаў Яўген Капылоў (г. Белгарад, Расія).

**№ 10**

**Белыя простыя шашкі:** 41, 42, 44, 45, 37, 26, 29, 30, 24, 6, 7 (11).

**Чорныя простыя шашкі:** 43, 35, 28, 16, 18, 19, 13, 8, 10, чорныя дамкі: 46 (10).

Наступныя дзве пазіцыі складзеныя вядучым аддзела па правілах бразільскіх шашак.

**№ 11**

**Белыя простыя шашкі:** c1, d2, f2, h2, c3, g3 (6).

**Чорныя простыя шашкі:** a3, a5, h6, a7, e7, b8 (6).

**№ 12**

**Белыя простыя шашкі:** d2, f2, c3, g3, a7 (5).

**Чорныя простыя шашкі:** f4, h4, e5, f6, e7, h8 (6).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**Праверце свае рашэнні:**

Выпуск № 156 ад 06.01.22.

**№ 1** 1. 25-20 14:25 2. 34-30 25:34 3. 39:19 28:48 4. 38-33 13:24 5. 33-28 22:33 6. 31:02 48:31 7. 36:27+

**№ 2** 1. d2-c3 f8-g7 2. a3-b4 c5:a3 3. c1-b2 a3:f4 4. g3:c7 b6:d8 5. c3-b4 a5:c3 6. e1-d2 c3:g3 7. h2:d6 d8-e7 8. d6:f8 h4-g3 9. f8-c5 g3-h2 10. c5-g1+.

**№ 3** 1. 21-17 12:32 2. 44-39 36:18 3. 23:05 34:43

[ 3...34:23 4. 05:28 45:43 5. 46-41 38:20 6. 28-22 37:46 7. 22:05 ]

4. 46-41 45:23 5. 05:28 38:20 6. 28-22 37:46 7. 22:05 + прыватнае пабочнае рашэнне: пасля: 1. 21-17 12:32 ППР 2. 24-19 36:18 3. 23:5 34:14 4. 5:2 (Можна 4. 5:8 з наступным: 5. 8-12 ці 5. 46-41 і г. д. х.) 4...38:29 (калі: 4...45:34, то: 5. 2-7 38:29 6. 46-41 37:46 7. 44-39 34:43 8. 7:5 46-37 9. 5:46 х. Перамагае таксама: 5. 46-41 38:29 (калі: 5...37:46 то: 6.2-7 38:29 7.44-39 34:43 8.7:5 46-37 9.5:46 х.) 6.2-7 37:46 7.44-39 34:43 8.7:5 46-37 9.5:46 х.) 5.2-7 45:34 6.46-41 37:46 7.44-39 34:43 8.7:5 46-37 9.5:46 х. Перамагае таксама: 5. 46-41 37:46 (калі: 5...45:34, то: 6. 2-7 37:46 7. 44-39 34:43 8. 7:5 46-37 9. 5:46 х.) 6. 2-7 45:34 7. 44-39 34:43 8. 7:5 46-37 9. 5:46 х. Знайшоў С. Бурко.

№ 4 1. d6-c7 b8:d6 2. d2-c3 b4:d2 3. d4-e5 d6:b4 4. e5:c3 b4:d2 5. a1-b2 f8:d6 6. b2-c3 d2:b4 7. a3:e7 a5-b4 8. e7-f8 b4-c3 9. f8-h6 c3-b2 10. h6-c1 b2-a1 11. c1-h6+

№ 5 1. g3-f4 e3:g5 2. h4:d4 g1-h2 3. c5-d6 h2:d2 4. e1:c3 d8-e7 5. d4-e5 a7-b6 6. c3-b4 b6-a5 7. b4-c5+

№ 6 1. c1-d2 a3:g5 2. d6:f8 b8:d6 3. f8:c5 h2:f4 4. c5-f2+

Першымі дакладныя адказы даслалі: Л. Трафімчык (Іўе) С. Рашэцін (Ашмяны), С. Бурко (Орша), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), У. В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), А. Галаванаў, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна).

*Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013.*

*E-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**





# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

# Самае цікавае ў часопісе «Алеся» ў студзені

## ГОД БУДЗЕ ШЧАСЛІВЫ, КАЛІ ПРЫЙДУЦЬ «КОНІКІ»



**Старадаўні зімовы абрад «Конікі» жыве на Палессі не адно стагоддзе ў сваім аўтэнтычным варыянце. І сёння ўдзельнікі яго — не артысты фальклорных ці тэатральных калектываў, а звычайныя гараджане. Абрад нядаўна атрымаў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці Беларусі і можа прэтэндаваць на ўключэнне ў Спіс нематэрыяльнай спадчыны ЮНЕСКА.**

Ніхто не скажа дакладна, як даўно, з якіх часоў у Давыд-Гарадку на стары Новы год, альбо ў Шчодры вечар, людзі пачалі калядаваць з Канём. Зімовыя забавы, гульні і маскарады — старажытная славянская традыцыя. Сялянскія клопаты прыпынялі свой ход, наступаў час адпачынку. На Беларусі традыцыйна галоўнай гераіняй калядных гулянак выступае наравістая Каза, якая гучна грукае рагамі ў вароты, капрызіць і патрабуе ад гаспадароў дароў, інакш палохае, што не будзе ўраджаю ў полі і багацця ў хаце...

А вось у палескім Давыд-Гарадку галоўным персанажам каляднага абраду з'яўляецца Конь. Краязнаўцы гавораць, што шчадраваць з Канём прыдумалі казакі, якія доўгі час кватаравалі тут у складзе рускіх войскаў на пачатку XIX стагоддзя. Іншыя навукоўцы, спасылаючыся на даследаванні шэрагу замежных вучоных, лічаць, што сваімі каранямі гэта аўтэнтычная традыцыя можа сыходзіць у больш далёкую старажытнасць.

Але як бы там ні было, «Конікі» — любімае ўсімі свята. Вершнік і пераапранутыя калядоўшчыкі шумным натоўпам рухаюцца па горадзе, заходзяць у хаты і збіраюць пачастункі за выкананне вясёлых куплетаў і жартаў-прымавак, не забываючы пры гэтым выказаць добрыя пажаданні ў адрас шчодрых гаспадароў. Ёсць тут адно правіла: калядоўшчыкі заходзяць толькі ў тыя дамы, дзе гарыць святло і адкрыта брамка. Гэта знак, што іх тут чакаюць, гатовы прыняць, разам паспяваць і станцаваць, а галоўнае — ад душы абдарыць гасцінцамі ці грашыма. Палешукі гавораць, што «Конікаў» трэба абавязкова сустракаць са шчырай радасцю — тады год будзе шчаслівы.

## ЖАДАННЕ ЎСІМ ДАПАМАГЧЫ,

### або «Сіндром Чыпа і Дэйла»

**Ёсць людзі, якія заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу. Часам нас выклікаюць захапленне. Але ці заўсёды іншым так патрэбна гэта дапамога? Інакш псіхолагі не казалі б пра «сіндром Чыпа і Дэйла», які, на іх думку, не ўкладваецца ў паняцце нормы і мае патрэбу ў псіхалагічнай карэкцыі. Пра такі феномен у студзеньскім нумары «Алесі» падрабязна распавядае псіхолаг Таццяна ШАРАНДА.**

— Жаданне дапамагаць закладзена ў кожным з нас ад нараджэння, гэта біялагічная норма, уплеценая ў маральныя асновы грамадства. Так чалавеку як віду прасцей выжываць. Але часам гэтая асаблівасць становіцца гіпертрафіраванай, набывае нездаровы характар. Тады і кажуць аб «сіндроме Чыпа і Дэйла». У папулярнай псіхалогіі яго яшчэ называюць «сіндром выратавальніка»: чалавек кідаецца на дапамогу незалежна ад таго, прасілі яго пра гэта ці не.

Асноўныя прыкметы «сіндрома Чыпа і Дэйла» — пачуццё ўласнай значнасці і адчуванне ўлады над іншымі. «Ратавальнікі» адчуваюць задавальненне, умешваючыся ў чужыя справы, вырашаючы нечыя праблемы, праяўляючы актыўнасць, непадробны цікавасць і спачуванне. «Выратавальнік» становіцца ў нейкай ступені вяршыцелем лёсаў. У яго няма часцей за ўсё залежнасці ад падзякі выратаванага. «Разрульваючы» чужыя канфлікты, аказваючы садзейнічанне і падтрымку, ён уздымае сваю самаацэнку, цешыць пачуццё ўласнай выключнасці.

## КАЛІ Ў ВАС АЛЕРГІЯ НА ФАРБУ

Якая жанчына не спрабавала змяніць раптам вобраз? У большасці гэта пачынаецца з новай прычоскі. І тут мы можам сутыкнуцца з такой непрыемнасцю, як алергія на фарбу для валасоў.

Змена колеру валасоў — неабавязкова жаночы эксперымент, гэта робіцца і каб падтрымаць свой звыклы вобраз (напрыклад, зафарбаваць сівізну). Але замест прыгажосці, абяцанай вытворцамі моднага брэнда, жанчына атрымлівае алергічную рэакцыю. Як дапамагчы сабе, калі такое з вамі здарылася? І чым фарбаваць валасы, калі ў вас алергія? Пра гэта падрабязна расказваецца ў жаночым часопісе «Алеся».

## СІЛА МІКРАЗЕЛЯНІНЫ

**Літаральна нядаўна сярод прыхільнікаў здаровага харчавання з'явіўся новы трэнд — вырошчванне і ўжыванне ў ежу мікразеляніны.**

Мікразеляніна — гэта зусім маладзенькія ўсходы гароднiны і травы прыправ. Вышынёй яны не больш за 5—15 см і маюць мініяцюрныя сцяблінкі з семядолямі, а ў некаторых выпадках яшчэ некалькі лісцікаў. Ураджай мікразеляніны збіраецца ў залежнасці ад гатунку і віду раслін. Звычайна — праз тыдзень пасля прарастання насення.

Гэта самы хуткі ўраджай, які можна атрымаць ва ўмовах гарадской кватэры. У маладых раслінах утрымліваецца шмат карысных вітамінаў і мінералаў, значна больш, чым у звычайнай зеляніне.

— Мне запомнілася нядаўняя сустрэча прадстаўнікоў ідэалагічнага актыву Лідскага, Іўеўскага, Воранаўскага раёнаў з Аляксеем Талаем — членам Канстытуцыйнай камісіі, паралімпійскім чэмпіёнам, беларускім Нікам Вуйчычам і проста патрыётам сваёй краіны. Клубок у горле стаяў ва ўдзельнікаў сустрэчы, калі Аляксей казаў пра свайго дзеда, які прайшоў Вялікую Айчынную вайну, на руках насіў шаснаццацігадовага ўнука, скалечанага авіяцыйнай бомбай, якая раптоўна выбухнула... Гэта ж адбылося праз дзесяцігоддзі пасля заканчэння ваенных дзеянняў на беларускай зямлі...

Рэха ўжо далёкай вайны адклікаецца болем не толькі ў сям'і Аляксея Талая, але і ў кожнага, хто бачыць і чуе простыя шчырыя словы аб любові да малой радзімы, аб неабходнасці абараняць яе. У генетычнай памяці нашага народа закладзена матрыца дабра і справядлівасці, гераізму і асабістай адказнасці за сям'ю і тых, хто побач.

Неадноўчы пацярпеўшы ад войнаў на сваёй тэрыторыі, Беларусь імкнецца да мірнага добрасуседства з іншымі краінамі, што замацавана асобным артыкулам Канстытуцыі. Больш за тое, у праекце новай Канстытуцыі прапісаны дадатак да артыкула 18: «Рэспубліка Беларусь выключае ваенную агрэсію са сваёй тэрыторыі ў дачыненні да іншых дзяржаў». Аднак з улікам таго, што ў свеце неспакойна, замежныя дзяржавы сцягваюць ваенны кантынгент, баявую тэхніку да граніц нашай, можа, варта было б дадаць радок: «разам з тым беларуская дзяржава распачне ўсе неабходныя меры па абароне сваіх граніц ад захопнікаў звонку»? Хоць і так зразумела: любімую не аддадзім!

Я ўпэўненая: кожны, хто бярэ ўдзел у сустрэчах з Аляксеем Талаем, іншымі патрыётамі роднай Беларусі, якія шчыра, ад усяго сэрца жадаюць дабра ёй і ўсяму народу, разумеюць: за іх словамі — праўда! І возьмуць удзел у рэферэндуме, на які будзе вынесена новая Канстытуцыя. Гэта ж закон не для кагосьці чужога — для нас... Нам з ім жыць, гадаваць дзяцей, будаваць будучыню, у якой захаваюцца ўсе напрацоўкі краіны за мінулыя дзесяцігоддзі і будуць створаны ўмовы для новых дасягненняў.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 20 студзеня 2022 года.

# НАВУКА ГОЛАСУ, ДЫЗАЙН ЛЕКАЎ І САКРЭТ ШЧАСЛІВАГА БАЦЬКОЎСТВА

**«Інавацыйны шторм» — гэта бітва простых слоў са складанымі тэрмінамі: у нефармальнай абстаноўцы прадпрымальнікі і навукоўцы даступна расказваюць аб тэхналогіях і інавацыях, якія ў хуткім часе могуць карэнным чынам змяніць наша з вамі жыццё. Форма зносін з залай прадугледжвае кароткія выступленні і пытанні пасля іх. Дарэчы, слухачы даслалі спікерам больш як 80 пытанняў.**

**Таксама госці форуму змаглі паўдзельнічаць у інавацыйных забавах: праявіць свае мастацкія здольнасці ў віртуальнай рэальнасці, зрабіць тату пры дапамозе тату-прынтара, пазмагацца адзін з адным, выкарыстоўваючы сілу думкі, а таксама зрабіць яркія фота ў неонавым тунэлі.**

## «Выстрал» па малекулярнай мішэні

У лістападзе мінулага года амерыканская кампанія Pfizer заявіла, што выраблены ёю антывірусны прэпарат для лячэння COVID-19, які прымаецца пераральна, па выніках другой фазы клінічных выпрабаванняў паказаў зніжэнне рызыкі шпіталізацыі або смяротнага зыходу на 89 %. У Pfizer выказалі жаданне атрымаць дазвол на экстраннае выкарыстанне свайго новага лякарства...

Увогуле, пандэмія COVID-19 аказалася беспрэцэдэнтнай для XXI стагоддзя і закранула краіны з насельніцтвам у мільярды чалавек. Таму пошук лекаў ад каранавіруса стаў для многіх фармкампаній задачай нумар адзін.

Улічваючы актуальнасць тэматыкі, Нацыянальная акадэмія навук таксама аб'явіла вялікую колькасць грантаў для навукоўцаў, якія займаюцца даследаваннем каранавіруса. Пра гэта расказала **вучоны сакратар Савета маладых вучоных НАН Беларусі, спецыяліст у сферы біяінфарматыкі і распрацоўкі алгарытмаў камп'ютарнага дызайну лекаў, старшы выкладчык БДУ Ганна КАРПЕНКА.**

— Паводле ацэнак экспертаў, інвестыцыі на стварэнне аднаго лекавага прэпарату вагаюцца ад 1 да 2,6 млрд долараў, а стварэнне і выхад на рынак новага прэпарату займае ад 10 да 15 гадоў — усё залежыць ад актуальнасці і ступені вывучанасці таго ці іншага захворвання, — кажа Ганна. — Аднак пандэмія выразна дала зразумець, што ў чалавецтва няма такіх рэсурсаў па часе, і мы павінны знаходзіць эфектыўныя рашэнні значна хутчэй! Да таго ж усе выдаткі могуць стаць марнымі, калі створанае лякарства не пройдзе клінічныя выпрабаванні.

Трэба заўважыць, што Ганна Карпенка з'яўляецца часткай каманды, якая трапіла ў ТОП-10 па выніках работы вучоных НАН Беларусі за 2020 год — за ідэнтыфікацыю метадамі камп'ютарнага скрынінгу і малекулярнага мадэлявання патэнцыяльных інгібітараў каранавіруса SARS-CoV-2. Гэтая каманда — мультыдысцыплінарная і складаецца са спецыялістаў у такіх галінах як хімія, біялогія, фізіка і матэматыка. Ганна — магістр фізікі і матэматыкі, спецыяліст у галіне біяінфарматыкі.

— Стварэнне і запуск інавацыйных лекавых прэпаратаў — абавязковая ўмова існавання любой канкурэнтаздольнай фармацэўтычнай кампаніі. Але аб'ём інвестыцый у распрацоўку лекаў расце разам з патрабаваннямі рэгулятараў да доказу эфектыўнасці і бяспечнасці прэпаратаў, — кажа малады вучоны. — Вытворцы шукаюць эфектыўныя спосабы распрацоўкі новых малекул, каб з іх дапамогай павялічыць колькасць прэпаратаў, якія маюць патэнцыйныя магчымасці стаць прарыўнымі для рынку.

Тэхналогія лекаў «спусціласяа» сёння на малекулярны ўзровень і грунтуецца на такім паняцці як малекулярная мішэнь. Гэта канкрэтная малекула ў арганізме, біяхімічная функцыя якой цесна звязана з узнікненнем або развіццём пэўнай паталогіі. Уздзеянне на яе малекулай прэпарату дае тэрапеўтычны эфект. Амаль у кожнага захворвання існуе свая малекулярная мішэнь — і нават не адна. Цяпер адным з самых перспектыўных напрамкаў для вырашэння гэтых задач з'яўляецца матэматычнае мадэляванне лекавых сродкаў. Яго развіццё абумоўлена ўдасканаленнем камп'ютарных тэхналогій і магчымасцю апрацоўкі з іх дапамогай вялікіх масіваў даных.

Першы этап — выбар мішэні. Затым — падбор хімічнага злучэння. **Прааналізаваўшы сотні мільёнаў хімічных злучэнняў, камп'ютар здольны знайсці тыя з іх, якія могуць знішчыць ці блакіраваць пэўную мішэнь.** Камп'ютарнае мадэляванне дазваляе ажыццяўляць, па сутнасці, тыя ж працэсы, якія праходзяць у рэальным эксперыменце ў прабірцы, толькі рабіць гэта значна хутчэй і танней... Дапамагае фармкампаніям адмовіцца ад скрынінгу «бесперспектыўных» рэчываў і вывучаць толькі эфектыўныя злучэнні і тым самым сэканоміць дзясяткі мільёнаў долараў.

— Суперкамп'ютар выкарыстоўваецца для таго, каб на стадыю даклінічных і клінічных выпрабаванняў траплялі, дапусцім, не тысяча злучэнняў, а сто, паколькі гэта самыя дарагія і працаёмкія па часе стадыі стварэння новых лекавых сродкаў. Такім чынам шанцы на поспех значна павялічваюцца, — тлумачыць Ганна Карпенка. — Без іх лякарства не будзе зарэгістравана. Камп'ютарная база даных утрымлівае больш за мільярд злучэнняў, і з дапамогай камп'ютара вызначаецца, наколькі яны падыходзяць да абраных мішэняў. Ёсць розныя метады праверкі таго, як абраныя злучэнні спалучаюцца паміж сабой, як яны будуць паводзіць сябе ў пэўных умовах, пры пэўных тэмпературах і гэтак далей.

Паколькі суперкамп'ютарныя тэхналогіі прыходзяць даследчыкам на дапамогу, сёння кожная фармацэўтычная кампанія мае даследчы аддзел, у якім працуюць спецыялісты па штучным інтэлекце. Але ніякае матэматычнае мадэляванне ўсё роўна не можа замяніць даклінічныя і клінічныя выпрабаванні — без іх лякарства проста не будзе зарэгістравана...

Пакуль што ковід ва ўсім свеце лечаць прэпаратамі, якія распрацоўваліся для тэрапіі іншых захворванняў. А пандэмія паказала ўсім важнасць камп'ютарнага мадэлявання лекаў, калі патрэбныя хуткія і эфектыўныя рашэнні...

## Генетычна дасканалыя людзі

**Прадпрымальнік з вопытам адкрыцця 27 розных бізнесаў, інвестар, стваральнік і сайладальнік групы кампаній EvaClinic і рэпрадуктыўнага банка Adam&Eva Андрэй ПЯКУРАЎ** упэўнены, што навука і грамадства сёння рухаюцца ў бок таго, каб у кожнага чалавека быў на руках поўны разгорнуты генетычны аналіз. Тады пры планаванні цяжарнасці пары змаглі б супаставіць свае геномы, каб разумець і пазбягаць рызыкі ўзнікнення патэнцыяльных адхіленняў у геноме будучага дзіцяці. А натуральнае зачацце ён параўноўвае з гульнёй у рулетку.

— Думаю, што зусім хутка ўвесь цывілізаваны свет пяройдзе да ўсвядомленага зачацця дзіцяці паза целам чалавека з ужываннем прэімплантацыйнага генетычнага тэсціравання (ПГТ) эмбрыёна. Гэта будзе гэтак жа натуральна, як і нараджэнне дзіцяці ў радзільным доме, а не «ў полі», — разважае ён. — Дыягностыка храмасомных анамалій — найважнейшы складнік інавацыйных рэпрадуктыўных тэхналогій. Без ПГТ не абыходзіцца ніводнае планаванне цяжарнасці ў рамках пратакола экстракарпаральнага апладнення, што дазваляе істотна павысіць эфектыўнасць самой працэдуры.



Статыстыка сцвярджае, што чым старэйшая будучая маці, тым вышэйшая рызыка: калі ў 30 гадоў шанцы ў жанчыны нарадзіць здаровае немаўля складаюць 92—96 працэнтаў, то бліжэй да 40 гадоў і ў больш познім узросце яны зніжаюцца да 5 працэнтаў.

У норме ўвесь генетычны матэрыял чалавека размеркаваны ў 46 храмасомах (23 парах). Парушэнні колькасці храмасом узнікаюць дастаткова часта, і будучы эмбрыён можа атрымаць лішнюю храмасому або можа адбыцца страта якой-небудзь з іх. Найбольш часта пры правядзенні ПГТ аналізуюць 5 храмасом (13, 18, 21, X і Y), парушэнні ў якіх выклікаюць развіццё найбольш небяспечных спадчынных захворванняў.

У 1997 годзе на экраны выйшаў амерыканскі фантастычны фільм «Гатака». У ім распавядалася пра генетычна дасканалых людзей, якія займаюць у грамадскай іерархіі самыя высокія пазіцыі. Іх фізічная і інтэлектуальная дасканаласць фарміравалася яшчэ ў прабірках, прычым бацькі маглі заказаць і пол дзіцяці, і колер яго вачэй. А вось людзі, якія нарадзіліся звычайным шляхам (іх называлі «дзецьмі кахання»), сталі ў грамадстве людзьмі другога сорту. Праз чвэрць стагоддзя фантастыка пачынае ажыццяўляцца. Узровень развіцця сучаснай генетыкі ўжо сёння дазваляе бацькам выбраць пол дзіцяці і колер яго вачэй. У апошнія гады нават разгаралася дыскусія аб этычнасці з'яўлення «дызайнерскіх немаўлят».

Раней адзіным даступным метадам адбору эмбрыёнаў для пераносу ў поласць маткі была ацэнка марфалогіі (вонкавага выгляду). Але, на жаль, няма выразнай сувязі паміж вонкавым выглядам эмбрыёна і яго генетычнай «нармальнасцю». А прэімплантацыйнае генетычнае тэсціраванне дазваляе вызначыць генетычныя парушэнні ў эмбрыёна яшчэ да яго імплантацыі.

Для выяўлення прыроджаных ці генетычных парокаў развіцця плода будучыя маці праходзяць ультрагукавы скрынінг тройчы — на першым, другім і трэцім трыместры цяжарнасці. Але гэты від даследавання, на жаль, не дае адказы на ўсе пытанні. І калі парокі ўсё ж такі выяўляюцца, то жанчыне прапануюць спыніць цяжарнасць. Асабліва балюча страціць дзіця на позніх тэрмінах цяжарнасці...

— А пры зачацці ў прабірцы такія рызыкі зведзены да мінімуму, — сцвярджае Андрэй Пякураў. — Больш за тое, сёння **практыкуюцца такія праграмы, як «Адкладзенае бацькоўства» і «Адкладзенае мацярынства».** У рамках першай можна замарозіць сперматазоіды на будучыню і выкарыстаць іх, калі мужчына будзе гатовы да нараджэння дзіцяці. Шанцы на паспяховае зачацце з узростам змяншаюцца не толькі ў жанчын, але і ў мужчын. Якасць сперматазоідаў зніжаецца і ў сітуацыі, калі мужчына працуе, напрыклад, на шкоднай вытворчасці ці пасля перанесенай хіміятэрапіі... Таму такая праграма — выдатная «страхоўка», якая засцерагае ад падобных рызык. Жанчыны таксама могуць замарозіць уласныя яйцаклеткі, калі мацярынства пакуль не ўваходзіць у іх планы. Да таго ж з узростам рызыкі генетычных анамалій у дзіцяці растуць. Клеткі захоўваюцца ў вадкім азоце пры пастаяннай тэмпературы мінус 196 градусаў. Усе біялагічныя працэсы ў іх прыпыняюцца.

## Найлепшыя словы — інтанацыі

А цяпер уявім сабе наступную сітуацыю. У пакоі раздаецца тэлефонны званок. Мы паднімаем трубку, размаўляем, і хоць ніколі не бачылі суразмоўніка, наш мозг пачынае маляваць у галаве «партрэт» незнаёмца. А калі нам прапануюць, напрыклад, здзейсніць якую-небудзь куплю, то з двух прадаўцоў з абсалютна аднолькавымі таварам ці паслугай мы робім свой выбар на карысць аднаго. Як гэта адбываецца?

**Прафесійны спікер, спецыяліст у моўным іміджы, акцёр і тэатральны педагог Андрэй БІБІКАЎ** расказаў удзельнікам «Інавацыйнага шторму» пра навуку голасу і чаму навык публічных выступленняў важны абсалютна ва ўсіх сферах.

У прыватнасці, ён паведаміў, што ў даследаваннях рускага фізіёлага і псіхолага Уладзіміра Марозава аб эмацыянальным слыху ёсць важная высноexterna наконт таго, што аўдыторыя стварае псіхалагічны партрэт спікера па тым, што чуе. Дык вось, доктар біялагічных навук прыйшоў да высновы, што ў нашым мозгу ёсць канкрэтныя зоны, якія адказваюць за тое, каб счытваць эмоцыі іншага чалавека праз голас. І за сотыя долі секунды ён здольны стварыць вельмі дакладны псіхалагічны партрэт чалавека.

Эмацыянальная экспрэсіўнасць гаворкі — найважнейшы сродак зносін і ўзаемаразумення людзей. Гаворка — не проста перадача інфармацыі знакамі, гэта эмоцыі, вобразы, гэта нашмат большае. Аўдыторыя слухае тэкст, але разумее яна менавіта матыў прамовы — інтанацыі і сэнсы, якія укладваюцца ў словы. Фраза «добры дзень» , прамоўленая з рознай інтанацыяй, можа істотна адрозніваццa па сэнсе.

**Калі чалавек выходзіць і нешта расказвае публіцы, важна не толькі тое, ШТО ён расказвае, а яшчэ і ЯК ён гэта робіць.** Экспрэсіўная гаворка заразлівая па сваёй прыродзе, яна дапамагае слухачу лепш разумець апавядальніка. Пераканаўчая гаворка — гэта не толькі інтэлектуальнае, але і эмацыянальнае ўздзеянне на суразмоўніка. Дарэчы, нейрабіёлагі з Прынстанскага ўніверсітэта даказалі, што чым больш ясна мы даносім думку, тым лягчэй з ёй згаджаецца суразмоўнік і тым больш актыўна ён уключаецца ў размову.

— Майце на ўвазе: негатыўныя эмоцыі наш мозг счытвае нашмат лепш. Словы адыходзяць на другі план. Паэтэса Марына Цвятаева казала, што «нашы найлепшыя словы — інтанацыі». А вось тэкст на паперы пазбаўлены эмоцый. Калі ў перапісцы ты не паставіў смайлік, то ўжо і не ведаеш — збіраць чамадан ці не, — жартуе Андрэй Бібікаў. — Многія людзі, якія маюць добры інтэлект і па сваёй сутнасці цікавыя асобы, тым не менш, не ўмеюць выказваць словамі свае думкі, пачуцці і эмоцыі. Але добра пастаўленая гаворка не з'яўляецца прыродным дарам, яе можна і трэба трэніраваць. Нават калі вы не збіраецеся стаць прафесійным аратарам, вам гэтыя навыкі не пашкодзяць і ў штодзённым жыцці.

Як данесці думку, каб яна рэзаніравала ў галаве чалавека, які вас слухае? Як дзяліць фразы на маўленчыя такты? Як расстаўляць лагічныя націскі? У чым сіла паўзаў і як правільна выбіраць інтанацыі? Усё гэта навука, якую можна пры жаданні засвоіць.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БЕЛАРУСЬРЕЗИНОТЕХНИКА»

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «Беларусьрезинотехника»** (УНП 700069297) 213829, Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102, в лице управляющего Шпакова Олега Петровича.

Повторные электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019/6 в экономическом суде Могилевской области будут проведены: **7 февраля 2022 г. 09.00–16.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY. Прием заявок и задатков с 22.01.2022 г. 09.00 по 04.02.2022 г. 17.00.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС | Минимальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | Станок трубогибочный, инв. № 6038 | 792,00 | 158,40 |
| 2 | Воздушный ресивер 6000х2000 (20 куб. м) – 3 т., б/у, инв. № 10051122 | 4704,00 | 2352,00 |
| 3 | Воздушный ресивер 6000х2000 (20 куб. м) – 3 т., б/у, инв. № 10051122 | 4704,00 | 2352,00 |
| 4 | Воздушный ресивер 6000х2000 (20 куб. м) – 3 т., б/у, инв. № 10051122 | 4704,00 | 2352,00 |
| 5 | Воздушный ресивер 5000х2000 (15 куб. м) – 2,5 т., б/у, инв. № 10051121 | 3072,00 | 1536,00 |
| 6 | Воздушный ресивер 5500х1500 (10 куб. м) – 1,6 т., б/у, инв. № 10051124 | 2784,00 | 1392,00 |
| 7 | Воздушный ресивер 3000х1000 (2,5 куб. м) – 0,6 т., б/у, инв. № 10051123 | 681,60 | 340,80 |
| 8 | Емкость дюралевая с ложементами 9500х2600 (50 куб. м) – 2,1 т., б/у, инв. № 10051126 | 7488,00 | 3744,00 |
| 9 | Емкость дюралевая с ложементами 9500х2600 (50 куб. м) – 2,1 т., б/у, инв. № 10051126 | 7488,00 | 3744,00 |
| 10 | Емкость дюралевая с ложементами 9500х2600 (50 куб. м) – 2,1 т., б/у, инв. № 10051126 | 7488,00 | 3744,00 |
| 11 | Емкость-миксер-6000х2500 (30 куб. м) – 1,3 т., б/у, инв. № 10051128 | 1632,00 | 816,00 |
| 12 | Ресивер (цех № 7) – 4500х1500 (22 куб. м) – 0,5 т., б/у, инв. № 10051118 | 4992,00 | 2496,00 |
| 13 | Ресивер (цех №7) – 4500х1500 (22 куб. м) – 0,5 т., б/у, инв. № 10051118 | 4992,00 | 2496,00 |
| 14 | Валок заготовка 610х800, б/у, инв. № 10509166 | 6240,00 | 3120,00 |
| 15 | Валок заготовка 610х800, б/у, инв. № 10509166 | 6240,00 | 3120,00 |
| 16 | Валок заготовка 610х800, б/у, инв. № 10509166 | 6240,00 | 3120,00 |
| 17 | Рельсы Р-43, 131 271 кг, б/у, номенклатурный № 10249826 | 114 678,35 | 57 339,17 |
| 18 | Тепловоз ТГМ23, 1973 г. в., заводской № 1157, б/у, номенклатурный № 10506629 | 45 216,00 | 22 608,00 |
| 19 | Вальцы 800 Рифайнер, б/у, инв. № 4043, | 16 740,00 | 11 160,00 |
| 20 | Вальцы 800 Рифайнер, б/у, инв. № 4045 | 16 740,00 | 11 160,00 |
| 21 | Вальцы 800 Рифайнер, б/у, инв. № 4046 | 16 740,00 | 11 160,00 |
| 22 | Вальцы 800 Рифайнер, б/у, инв. № 4047 | 16 740,00 | 11 160,00 |
| 23 | Вальцы 800 Рифайнер, б/у, инв. № 4048 | 16 740,00 | 11 160,00 |
| 24 | Вальцы 800 Рифайнер, б/у, инв. № 4049 | 16 740,00 | 11 160,00 |
| 25 | Электрокара ЕП-011, 1987 г. в., б/у, инв. № 9161 | 4860,00 | 3240,00 |
| 26 | Электрокара ЕС-301, 1986 г. в., б/у, инв. № 9159 | 9504,00 | 6336,00 |

Электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019/6 в экономическом суде Могилевской области будут проведены: **22 февраля 2022 г. 09.00–16.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY. Прием заявок и задатков с 22.01.2022 г. 09.00 по 21.02.2022 г. 17.00.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС 20 % | Минимальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль легковой, MERCEDES-BENZ E250, седан, 2010 г. в., кузов (рама) № WDD2120031F345847, рег. знак 1001MI-6, инв. № 8578 | 36 480,00 | 25 536,00 |
| 2 | Детский оздоровительный лагерь «Ромашка», Могилевская обл., Бобруйский р-н, д. Панюшковичи (состав лота на beltorgi.by) | 1 878 735,00 | 1 315 114,50 |

**Местонахождение предметов торгов – Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102, тел. для ознакомления +375 29 698-53-53.**

Для участия в торгах необходимо в указанный срок: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация». Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. Победитель торгов обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 10 календарных дней со дня завершения электронных торгов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет торгов в соответствии с условиями договора купли-продажи, но не позднее 30 календарных дней, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов.

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **Унитарное предприятие «ИЦТ ГОРИЗОНТ», г. Минск, ул. Куйбышева, 35-1** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**
**Месторасположение: г. Минск, ул. Красная, 7**

| № лота | Наименование (назначение) | Инвентарный № | Начальная цена с НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1 | Токарно-винторезный станок 1ИС611В | 95410 | 5 400,00 |
| 2 | Токарно-винторезный станок 1ИС611В | 95411 | 4 200,00 |
| 3 | Станок универсально-фрезерный УФ 250-02 | 95426 | 8 760,00 |
| 4 | Универсально-фрезерный станок 676П | 95428 | 4 080,00 |
| 5 | Гравировально-фрезерный станок 6Л463 | 95433 | 1 440,00 |
| 6 | Координатно-расточный станок 2421 | 95437 | 3 240,00 |
| 7 | Станок точильно-шлифовальный двусторонний 3Л631 | 95032 | 1 128,00 |
| 8 | Универсально-заточной станок 3М642 | 95458 | 3 120,00 |
| 9 | Круглопильный станок ДЦ-334 | 95460 | 1 200,00 |
| 10 | Токарный станок MN80A | 95563 | 2 280,00 |
| 11 | Универсально-фрезерный станок | 98186 | 7 320,00 |
| 12 | Координатно-расточный станок 24К40СФ4 | 95555 | 12 120,00 |
| 13 | Ножницы угловые | 95622 | 1 800,00 |
| 14 | Полировальный шлифовальный станок 3В852 | 95566 | 10 440,00 |

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов **www.cpo.by**. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **10 (десять) процентов** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Извещение о предыдущих электронных торгах опубликовано в газете «Звязда» 18.12.2021

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 03.02.2022**.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема документов:** заявки на участие в электронных торгах принимаются на ЭТП «ИПМ-Торги» по **02.02.2022 до 17.00**

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06 E-mail: auction@cpo.by** |

---

## ООО «СпецРеализация»
### объявляет о проведении вторых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества
### ООО «Полоцкая трубопроводная компания»
(УНП 391461231, Витебская обл., г. Полоцк, ул. Дзержинского, 116-73),
### находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)

***Дата и время проведения торгов*: 04 февраля 2022 года**. Начало – 10.00. Заявки принимаются с 20 января 2022 года по 02 февраля 2022 года.

***Место проведения торгов:*** г. Минск, пр-т Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница «Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «Полоцкая трубопроводная компания» (УНП 391461231)** в лице антикризисного управляющего – директора Частного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт» Комса Инги Анатольевны, тел. 8 (029) 133-01-01.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 5 %. Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на Интеренет-сайте http://bankrot.gov.by/. Контактный телефон +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах:
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 202 (29571) за 20.10.2021
РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 238 (29607) за 09.12.2021

---

## ДОПОЛНЕНИЯ И ИЗМЕНЕНИЯ № 4 В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ
### по объекту «Строительство многоэтажного жилого комплекса в поселке Прилуки Минского района. Жилой дом № 18 по генплану», *опубликованную в газете «Звязда», номер от 26.05.2021 г. № 97 (29466)*

Общество с ограниченной ответственностью «МайКлассКом» информирует о внесении дополнений и изменений в вышеуказанную проектную декларацию следующего содержания:

Место нахождения Застройщика: 223011, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, Сеницкий сельский Совет, а г. Прилуки, ул. Майская, д. 2, пом. 108.

Почтовый адрес Застройщика: 220100, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Кульман, д. 11, офис 1, этаж 7, тел./факс +375 (17) 320-05-50.

Контактные телефоны специалистов отдела продаж: +375 33 6666 372, +375 29 8888 372.

Режим работы: понедельник–пятница: с 08.30 до 17.30, обед: 13.00–14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Сведения о количестве объектов долевого строительства (квартир), предлагаемых для заключения договоров, ценах на эти объекты долевого строительства и условиях их возможного изменения застройщиком в одностороннем порядке в жилом доме для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей на коммерческой основе (без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика) на дату опубликования настоящих дополнений и изменений в проектную декларацию:

- 20 (двадцать) однокомнатных квартир общей площадью по проекту от 39,87 до 43,27 кв. метров. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную до 1000 долларов США;
- 20 (двадцать) двухкомнатных квартир общей площадью по проекту от 55,74 до 66,75 кв. метров. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную до 950 долларов США;
- 20 (двадцать) трехкомнатных квартир общей площадью по проекту от 71,71 до 95,72 кв. метров каждая. Стоимость за 1 (один) кв. метр общей площади квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную до 900 долларов США.

В организации проводятся акции, действует система регулирования цены квадратного метра, зависящая от общей площади, этажа, типа планировки квартиры, а также система скидок, зависящая от размера первоначального взноса, периода рассрочки и графика внесения платежей. Цена объекта долевого строительства (цена договора), установленная в договоре в привязке к иностранной валюте, является неизменной до окончания строительства, за исключением случаев изменения цены объекта долевого строительства по соглашению сторон.

Подлежащая оплате сумма определяется в белорусских рублях по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа, если иной курс или иная дата его определения не будет установлена соглашением сторон, путем подписания дополнительного соглашения к договору.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и о ходе работ по строительству можно в отделе по работе с клиентами ООО «МайКлассКом» по адресу: г. Минск, ул. Кульман, д. 11, офис 1, этаж 7, отделе продаж по адресу: Минская область, Минский район, Сеницкий сельский Совет, а г. Прилуки, ул. Майская, д. 2, пом. 108 и (или) на сайте http://vyselka.by/, а также по контактным телефонам специалистов отдела продаж: +375 33 6666 372, +375 29 8888 372.

УНП 191443174

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
### по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов № **2022.Ч.002.00004** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Витебский картонажно-полиграфический комбинат «Покровский», Республика Беларусь, г. Витебск, ул. Покровская, 5, тел. +375 (212) 665361.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, +375 (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения повторных торгов: 07.02.2022 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 200/С-49794 площадью 803,9 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Покровская, 10А, наименование – ангар-склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: проезжая часть (участок 1, участок 2, участок 3, участок 4), пешеходная часть (участок 1, участок 2), площадка (участок 1, участок 2), ограждение, ворота, ворота. Кап. строение с инв. № 200/С-49795 площадью 49,6 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Покровская, 10А/2, наименование – сторожевая, назначение – здание специализированное иного назначения. Составные части и принадлежности: два навеса, шесть складов, проезжая часть (участок 1, участок 2, участок 3, участок 4), пешеходная часть (участок 1, участок 2), площадка (участок 1, участок 2), ограждение, ворота, ворота.

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым № 240100000002000187 (право постоянного пользования) площадью 0,3992 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Покровская, 10А, целевое назначение – земельный участок для обслуживания ангар-склада и сторожевой. Назначение зем. участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: зем. участок для размещения объектов обрабатывающей промышленности. Сооружения благоустройства кап. строений с инв. № 200/С-49794, № 200/С-49795 являются общими сооружениями благоустройства земельного участка с кадастровым номером № 240100000002000187. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Нач. цена: 226 931,52 бел. руб. с учетом НДС.**

**Задаток: 22 693,15 бел. руб.**

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом ЭТП. **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 04.02.2022. Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия повторных электронных торгов**: победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, оплатить услугу по размещению одного аукциона и затраты на обслуживание ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; оплатить проведение независимой оценки предмета электронных торгов; заключить договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 15 рабочих дней со дня проведения электронных торгов, оплатить предмет электронных торгов в течение 20 рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи. С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375295121943.

---

В суд Ганцевичского района Брестской области 10.01.2022 поступило заявление Гордей Прасковьи Григорьевны о признании умершим Гордея Константина Антоновича, 04.03.1951 года рождения, уроженца д. Малые Круговичи Ганцевичского района Брестской области, последнее место жительства и пребывания: Республика Беларусь, Брестская область, г. Ганцевичи, ул. Строителей, д. 31а, кв. 1.

Предлагается всем в течение двух месяцев с момента данной публикации сообщить о данном гражданине (Гордей К. А.) имеющиеся сведения в суд Ганцевичского района Брестской области (225432, Брестская область, г. Ганцевичи, ул. Коммунистическая, 21, gancevichi@court.by).




## УРАЧ — НЕ ЦЯЛЯ, БАЧЫЦЬ КРУЦЯЛЯ

Некалі ў нашай вёсцы Каменка чаго толькі ні было: школа, дзве крамы, аптэка, пошта, кантора саўгаса, бальніца... Прычым працаваў там не адзін фельчар. Былі свае стаматолаг, акушэрка, нават лабарантка. А з часам з'явіўся яшчэ і шафёр, бо гэта шаноўная медустанова атрымала сваю машыну — на жаль, не новую: дабіты, крыты (яшчэ і мацюкамі) УАЗ... Але і яму былі ў вёсцы рады.

Ці не найбольш цешыўся Анатоль — малады мясцовы жыхар, які атрымаў нядрэнную работу, сеў за руль. А калі так, то трэба ж ехаць, везці доктара то да аднаго хворага, то да другога... Да пятага, у пятніцу, Толя адмовіўся, сказаў, што машына няспраўная. Маўляў, месца ёй на звалцы металалому, а не на дарозе.

— Што барахліць? Ты канкрэтна кажы, — папрасіў яго доктар.

— Ды карбюратар, — адказаў кіроўца.

— І што, нічога нельга зрабіць? Ні стары паправіць, ні новы дастаць?

— Новы? — насцярожыўся Анатоль. — Гэта можна! У мяне на аўтабазе свой чалавек працуе. За 20 рублёў што хочаш здабудзе... Мігам!

Доктар дастаў з кішэні дзве дзясяткі, паклаў на стол: бяры, маўляў, даставай і мяняй.

...У панядзелак зранку ён жа, той доктар, пытае ў шафёра: як справы, што з рамонтам машыны?

— Ды ўсё ў парадку, — хваліцца той. — Машына — звер, заводзіцца з паўабарота!

Разам з доктарам яны выйшлі ў двор, каб ехаць на выклік, Толя завёў рухавік, трохі пагазаваў.

— Новы карбюратар? — удакладніў урач.

— А як жа! Ледзь ад масла адмыў!

— Дай паглядзець, — зацікавіўся медык, схіліўся над матoрам, адшукаў на карбюратары дзве літары «К» і «Б», спытаў у Толі:

— Ведаеш, што яны азначаюць? Не? Тады я скажу: «Каменская бальніца».

Аказалася, што доктар быў яшчэ і шафёрам, ведаў хітрыкі іншых, людзям давяраў, але і правяраў.

Толя пасля гэтай праверкі мусіў вярнуць яму 20 рублёў і, як выглядала, зразумець, што наступны раз можа застацца не толькі без так званых левых грошай, але і без «правых» — то-бок без работы і без зарплаты.

**Іван Пяшко,**
*г. Шчучын.*

## ДВА ВАСІЛІ І АДЗІН ВЫСОЦКІ

Імя Васіль для мяне і было, і засталося ў нейкай ступені сакральным. На памяці свята Васілле з памятным «Васілёва маці пайшла шчадраваці...», незабыўныя Васіль Дзятлік, Чапаеў, Быкаў, Шукшын, Ліванаў... І яшчэ два добрыя знаёмцы, якія ў свой час вельмі здзівілі. Чым? Зараз раскажу.

У сямнаццаць гадоў, не паступіўшы на будфак політэхнічнага, я падаўся працаваць на будоўлю, дакладней — у досыць буйную арганізацыю, якая займалася рамонтам жылля. Спецыяльнасці я, вядома ж, не меў, так што класці цэглу і плітку, тынкаваць ды фарбаваць мяне вучылі на рабочым месцы як мінімум удвая старэйшыя дзядзькі... У іх, такіх жа, толькі суседзяў па рабочым інтэрнаце, я навучыўся не менш патрэбнаму — уменню ладзіць з людзьмі, жыць у калектыве.

Дык вось, якраз тады адным з маіх суседзяў па пакоі быў «марскі воўк» па імені Васіль, дзяцюк высокі, магутны... Са сваіх трыццаці гадоў ён, відаць, з дзесяць праплаваў па марах-акіянах, але ні гэтым, ні чым іншым не фарсіў. Мяне ж і наогул глядзеў, як малодшага брата... А неяк сказаў, што хоча ўсур'ёз пагаварыць, ды ўсё чамусьці адкладваў — быццам не рашаўся. Чаму — я зразумеў толькі потым.

Тынкоўшчыцай у нашай брыгадзе працавала вельмі адметная дзяўчына — рыжая, смяшлівая. Дзе яна, там, здавалася, і сонца — у любое надвор'е...

Факт, што на гэтакі цуд прыроды Васіль не мог надзівіцца! І не мог чамусьці наблізіцца — падысці, загаварыць... Мне ж казаў як роўнаму, што Люба запала ў душу — нават сніцца стала, што хоць сёння гатовы жаніцца...

Я пазнаёміў іх і... сапраўды вельмі хутка стаў сведкам на вяселлі, пасля чаго ў знак удзячнасці Васіль мне адкрыў яшчэ адну сваю таямніцу — любоў да Высоцкага. У нетрах яго чамадана, відаць, як найвялікшая каштоўнасць ляжаў тоўсты агульны сшытак, да апошняй клетачкі спісаны вершамі.

Я чытаў іх запоем, з вялікай асалодай, аж пакуль маладажонам не выдзелілі асобны пакой у іншым інтэрнаце...

А праз нейкі час сваім стаўленнем да Высоцкага мяне здзівіў яшчэ адзін Васіль. На нашым прадпрыемстве ён працаваў кіроўцам і быў адметны тым, што ў свой час пабраўся шлюбам з жанчынай, гадоў на 15 старэйшай за яго і з... чатырма дачушкамі (пятая была агульная).

Аднойчы на мікрааўтобусе мы з ім паехалі ў Маскву па досыць тэрміновай справе. Калі з ёй, той справай, было пакончана, і мы павярнулі назад, на адной з маскоўскіх вуліц Васіль раптам спыніўся, выскачыў з машыны — ірвануў да кіёска, купіў вялікі букет.

Мы, яго спадарожнікі, седзячы ў салоне, сталі смяяцца, што для кветніка, які чакае дома (жонка і пяць дзяўчат), аднаго букета будзе замала... Аднак Васіль спяшаўся не ў аўтобус і не дамоў. Ён нырнуў за рог дома і... прапаў. Мы нічога не зразумелі, а ўжо як злавалі!.. Праўда, да пары, бо, вярнуўшыся, Васіль сказаў, што тут паблізу Ваганькаўскія могілкі, і ён ніколі б сабе не дараваў, калі б не зайшоўся — не паклаў букет на магілу Высоцкага, не пакланіўся праху.

Абодвух Васілёў я ўспамінаю з цеплынёй і ўсмешкай. Вось і цяпер згадаў — на душы пацяплела...

**Іван Гаральчук,**
*г. Мінск.*

**Ад вядучай рубрыкі (і не толькі).**

*«Скончыўся чарговы, 2021 год — у тым ліку на нашым «провадзе». А гэта значыць, час збіраць камяні, то-бок перачытваць надрукаваныя гісторыі ды выбіраць з іх найлепшыя. Цікавы занятак, — піша* **старшыня вялікага чытацкага журы спадарыня Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны,** *— бо над многім можна яшчэ раз ад душы пасмяяцца, разгледзець «почырк» аўтара, ацаніць не толькі змест, але і форму падачы. Гэта як з анекдотамі: адзін і той жа можа атрымацца і смешным, і не — у залежнасці ад таго, хто раскажа.*

*Да таго ж па гісторыях са «звяздоўскага» «проваду» можна даследаваць асаблівасці жыцця ў розных мясцовасцях, адметнасці мовы. Продкі нездарма казалі: «Што сяльцо, то нараўцо, што хутарок, то гаварок». Быў час — гісторыі друкаваліся з мясцовымі слоўкамі-залацінкамі, іх тлумачэннем. Цікавая практыка! Яшчэ і для навукоўцаў...*

Што ўжо казаць пра чытачоў! Асобныя з іх (я дакладна ведаю) менавіта з-за «проваду» газету і выпісваюць, пішуць у рэдакцыю самі, знаходзяць новых сяброў. Факт, што гэтая рубрыка яшчэ пры жыцці заслугоўвае помніка — як мінімум у выглядзе асобнага выдання, прычым не аднаго... Пажывём, — дасць бог, убачым і нават пачытаем...

Да ліста, як вы здагадаліся, дадаецца спіс найлепшых гісторый.

*«Цяжка іх вылучыць, —* прызнаецца **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў,** *— бо незразумела, з якімі крытэрыямі падыходзіць, што ставіць на першы план? Гумар? Так, у кожнай гісторыі ёсць свае «разыначкі», вясёлыя нечаканыя павароты. Не кожны, праўда, іх можа «выпісаць», як след расказаць: здольнасці ў людзей, што на «тым канцы проваду», розныя... Але ж ад кожнага з аўтараў-апавядальнікаў зыходзяць шчырасць, дабрыня, жаданне падзяліцца нечым асабістым — цікавым для іншых. І гэта добра, што ў «Звяздзе» ёсць спецыяльны мадэратар (цяпер так модна казаць), які адрэдагуе дасланы матэрыял, дапаможа падаць яго ў найлепшым выглядзе.*

*...Трэба ўлічваць актыўнасць удзельнікаў? Ну вядома ж, трэба! Але нельга не адзначыць і тых, хто дасылае мо адну гісторыю, але сапраўды смешную, альбо рыфмаваную, што патрабуе больш часу, больш намаганняў. Таму я ўлічваў усе вышэйназваныя фактары і расставіў пераможцаў так...»*

Спіс, як той казаў, дадаецца...

Свой, ну вядома ж, адрозны, адмысловы, ён у лістах спадарынь Валянціны Гудачковай з Жыткавіч, Таццяны Новік з Клецка, Таццяны Маркавай з Віцебска, Галіны Нічыпаровіч з Уздзеншчыны, спадароў Мікалая Старых з Гомеля, Бараслава Радзевіча з Мінска, Уладзіміра Дзедава з Заслаўя... Кожнаму з якіх хочацца шчыра падзякаваць за іх працу, за думкі, якія, ну вядома ж, дапамаглі маленькаму рэдакцыйнаму журы вызначыць *тое, што спадабалася найбольшай колькасці чытачоў.* Такім чынам, у спісе найлепшых:

«Па шапцы... альбо Не сунься ў ваду, не знаўшы броду» **(Ю. Баўбель, г. Бабруйск)**, «Ажаніцца — трэба знаць» і «Словы для праўды» **(Н. Кандрашонак, г. Петрыкаў)**, «Ну а дружба пачынаецца... з усмешкі і не толькі з яе» **(Н. Бурко, Брэзінскі раён)**, «Калі навука пойдзе туга...» **(Л. Купрыянчук, Рагачоўскі раён)**, «Прыгажосць прыглядзіцца...» **(А. Чайкоўская, г. Гомель)**.

На лічаныя балы ад гэтых гісторый адсталі бываліцы С. Варонінай (Рагачоўскі раён), Л. Чыгрынавай (г. Мінск), З. Наваенкі (г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён), А. Петрашкевіч (Мінскі раён), Т. Раманавай (Наваполацк), Н. Шастаковай (г. Гомель), І. Гаральчука (г. Мінск), В. Сабалеўскага (г. Узда), В. Гаўрыша (г. Чавусы), В. Жураўскага (г. Жодзіна)...

Іншымі словамі, выйгралі, здаецца, усе, хто пісаў! І ўсе, хто чытаў, бо згадвалі сваё «перажытае-незабытае», дзяліліся назіраннямі, думкамі, вопытам і, вядома ж, усмешкамі! Сёння патрэба ў іх па-сапраўднаму вострая. А таму...

Конкурс працягваецца. Журы — і маленькае рэдакцыйнае (у складзе **намесніка галоўнага рэдактара газеты Наталлі Карпенкі, рэдактара аддзела Надзеі Дрындрожык, аглядальніка Веранікі Канюты**), і вялікае чытацкае, у склад якога можа ўвайсці кожны, хто прачытае ўсе гісторыі, надрукаваныя на працягу года, і потым дашле сваю дзясятку найлепшых, праце. Так што пішыце!

...Адмысловыя дыпломы і прызы пераможцам будуць высланы ў хуткім часе.

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# Каўбаса і сумленне

## Як першае сумяшчаецца з другім і пры чым тут... абмеркаванне Канстытуцыі

Перад святамі адправілі на «аптовую закупку» ў буйную краму адной вядомай сеткі нашых мужчын, бо тое, што меркавалася купіць, у жаночых руках праблематычна было б данесці нават да машыны. Уручылі хлопцам доўгі спіс, яшчэ і на словах праінструктавалі, што і як. Дзесьці праз гадзіну нашы «ганцы» ўваліліся ў кватэру з пакетамі і задаволенымі ад выкананай місіі тварамі. Разам з прадуктамі нам быў уручаны і ўжо згаданы спіс, і даўжэзны, мо на метр, чэк: «Правярайце!»

Правяраць, канешне, ніхто нічога не збіраўся, тым больш па чэку. Я яго ўзяла толькі дзеля таго, каб паглядзець, ці скарысталіся яны зніжкай па маёй дысконтнай карце і колькі гэта зніжка склала. Ну і прабеглася вачыма па ўсім спісе... За каўбасу сыравяленую «Баварскую» цаной па дваццаць чатыры рублі за кіло я зачапілася не з-за назвы і з-за цаны — з-за вагі. Яе, як сведчыў чэк, хлопцы купілі... усяго сто трыццаць два грамы. Што на фоне астатніх каўбас і іншых мясных далікатэсаў, якіх мы на сваю вялікую сям'ю бяром як мінімум па паўкіло, выглядала, мякка кажучы, дзіўна. Можа, нарэзку якую купілі ў прыгожай упакоўцы, падумалася. Не, сярод прадуктовай разнастайнасці, выкладзенай на стол, нічога падобнага не аказалася. Падзялілася назіраннямі са стрыечнай сястрой, што дапамагала на кухні. «Можа, купілі кавалачак ды там жа і з'елі? — выказала здагадку яна. — Але ж не, мы толькі што добра паснедалі...» — «Слухай, а можа, гэта яны закуску сабе купілі, а яшчэ «чакушку» ў тытунёвым аддзеле (там чэк іншы), ды ўжо святкаваць пачалі? — уключыла «дэдукцыю» я. — Пусціці казлоў у агарод». — «Ды не, не можа быць! Як жа яны тады на машыне ехалі...»

Карацей, нічога не заставалася, як выпытваць у мужыкоў, куды яны дзелі сто трыццаць два грамы «Баварскай». І няёмка было, але ж трэба было дазнаца праўду! Хлопцы пачалі ўсё адмаўляць: не куплялі ніякай каўбасы дадатковай. Але ж чэк сведчыў пра іншае. Пачалі звяраць з астатнімі прадуктамі — можа, штрых-код на якім памылковы, вось і прабілася на касе замест, скажам, мандарынаў тая няшчасная каўбаса. Нічога падобнага — усё супала з чэкам. Плюс «Баварская», якую ніхто і не нюхаў.

Свята мы адзначылі весела і хораша, але ж, як той казаў, асадачак застаўся. Мы з сястрой так да канца і не паверылі, што каўбасу не куплялі (куды падзелі — гэта ўжо іншая справа). Хлопцы дзьмуліся на нас за тое, што не верым...

Але самай цікавай была разгадка гэтай гісторыі. Я ёй падзялілася з прыяцелькай, якая працуе ў адной вялікай краме. Дык вось яна мне (пад вялікім сакрэтам) расказала, што ніякай памылкі ў чэку не было, што такім чынам некаторыя супрацоўнікі магазіна забяспечваюць сабе бясплатныя прадукты. Схема працуе прыкладна так. Перад святамі або на выхадныя (калі больш людзей і, адпаведна, пакупак) некалькі касіраў і прадаўцоў дамаўляюцца паміж сабой вынесці з крамы, скажам, дзве палкі... той жа «Баварскай». Прычым не ўкрасці, бо з гэтым строга, а купіць, не плацячы. Заплаціць за далікатэс пакупнікі. Галоўнае — не пралічыцца, «дзелячы» яго на дробныя часткі, каб пасля пры падвядзенні вынікаў у суме ўсё супала. Далей — справа тэхнікі. Вопытным вокам касір выбірае пакупніка з вялікай колькасцю тавару, які не лічыць кожную капейку, а значыць, не будзе звяраць чэк проста каля касы. Як правіла, у ролі такіх няўважлівых спажыўцоў выступаюць мужчыны, якіх жонкі на выхадных адпраўляюць «закупіцца на тыдзень». Сто грамаў каўбасы, прабітай у дваццаці найменнях, ніхто і не заўважыць, дый сума звычайна атрымліваецца вялікая, таму лішнія паўтара-два рублі таксама застануцца незаўважанымі. Карацей, некалькі такіх разявак на касе — і вуаля — патрэбная колькасць прадукту аплачана, можна смела яго забіраць. Ніякі пераўлік не выявіць, бо ўсё сыходзіцца.

Да таго ж гэта амаль што рызыкоўна. Большасць нават дома вялікі чэк з мноствам пакупак звяраць і глядзець не будзе. Калі ж, як у нашым выпадку, заўважаць, — таксама нічога. У краму разбірацца не пойдзеш — чым дакажаш, што ты тую каўбасу не купіў, дый няёмка неяк. У міліцыю звяртацца тым больш не будзеш з-за ста грамаў каўбасы. Вось такая беззаганная схема. Адзіны «пацярпелы» ў ёй — сумленне ўласна непасрэдных удзельнікаў. Але іх, мяркуючы па расповедзе маёй прыяцелькі, гэта не надта непакоіць: падумаеш, дробязь. Ніхто ж ад гэтага не збяднее... І калі спытаць гэтага касіра, ці лічыць ён сябе сумленным чалавекам, ён, не задумваючыся (і абсалютна шчыра!), адкажа: «Канешне!»...

Якая, спытаеце, ва ўсяго гэтага апоседу мараль? Не, гэта не пра тое, што «будзьце пільнымі», «як не дурань» і «лічыце грошы не адыходзячы ад касы» (хоць, можа, камусьці гэты досвед і спатрэбіцца). У апошнія дні, калі падводзяцца вынікі абмеркавання змяненняў у Канстытуцыю, гучыць думка, што сярод новых палажэнняў, якія выклікалі найбольш пытанняў, — і тыя, што датычацца самасвядомасці і сумленнасці чалавека. Некаторыя не разумеюць, навошта ў Асноўным Законе прапісваць абавязкі чалавека клапаціцца аб уласным здароўі, абавязкі бацькоў выхоўваць дзяцей у павазе да працы, да законаў сваёй краіны, да традыцый свайго народа...

Вось пішу «некаторыя», а ўяўляю тую незнаёмую мне касірку, якая свядома прабіла пакупніку лішнія сто трыццаць два грамы «Баварскай» каўбасы...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | **Антикризисный управляющий Открытого акционерного общества «МОТОВЕЛО» – ООО «Антикризисное управление», 220012, Минск, ул. Чернышевского, д. 5, офис 4, сектор «Б»** |
| **Продавец** | **ОАО «МОТОВЕЛО», г. Минск, пр-т Партизанский, 8 (тел. +375 17 298-14-22)** |
| Торги проводятся в форме открытого аукциона отдельными лотами на повышение стоимости с открытой формой предложения | |
| **Сведения о предмете торгов и начальной цене** | |

**Дебиторская задолженность:**

Лот № 1: ИП АНТОНОВИЧ ЕЛЕНА ВЛАДИМИРОВНА (УНП 192636417) на сумму 27,60 руб., начальная цена – 5,25 руб.

Лот № 4: Закрытое акционерное общество «БайкСет» (УНП 790258178) на сумму 5 482,57 руб., начальная цена – 1 096,51 руб.

